Сфера малога бізнесу ў эканоміцы займае важнае месца. Ці лёгка пачаць сваю справу ў Беларусі чалавеку «без сувязяў» і стартавага капіталу? «Звязда» вырашыла даведацца пра гэта. СТАР. 5

Аркестр імя Жыновіча — калектыў, які сёння, на думку спецыялістаў, стаў сапраўднай музычнай візітоўкай Беларусі. «Звязда» прадстаўляе яго мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора — Міхася Казінца. СТАР. 6

У футболе ёсць трэнеры звычайныя, а ёсць — унікальныя, якіх па ўсім белым свеце адзінкі. Галоўны трэнер зборнай па міні-футболе сярод інвалідаў па зроку Анатоль Іванавіч Усенка — адзін з такіх. СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 115 (27480) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1025 ГОДАЗЕ ХРЫШЧЭННЯ РУСІ 2013

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АБМЕРКАВАЎ З ПАТРЫЯРХАМ КІРЫЛАМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СВЯТКАВАННЯ 1025-ГОДДЗЯ ХРЫШЧЭННЯ РУСІ

У рамках рабочага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Расійскую Федэрацыю адбылася сустрэча кіраўніка дзяржавы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У Патрыяршым і Сінадальным духоўна-адміністрацыйным цэнтры Рускай праваслаўнай царквы (Краснадарскі край) бакі абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі да святкавання 1025-годдзя Хрышчэння Русі, якое будзе шырока адзначацца ў Беларусі, Расіі і Украіне. У прыватнасці, у цэнтры ўвагі была падрыхтоўка да ўрачыстасцяў, якія адбудуцца ў канцы ліпеня ў Мінску.

ПАДОБНЫ ДРУГОМУ ПАЎЛУ

27 чэрвеня ў Беларусь прыбываюць мошчы святога раўнаапостальнага князя Уладзіміра, з іменем якога звязана ўсталяванне праваслаўя на нашых землях.

Гэтая падзея прымеркавана да 1025-годдзя Хрышчэння Русі, якое сёлета святкуюць тры дзяржавы — Расія, Беларусь і Украіна. Часцінкі мошчаў пастаянна знаходзяцца ў Храме Хрыста Збавіцеля ў Маскве. 31 мая святыня з хросным ходам, які сімвалізуе адзінства праваслаўных славянскіх народаў, пакінула сталіцу Расіі. Ёй пакланіліся ўжо вернікі Уладзівастока, Хабараўска, Новасібірска, Екацярынбурга, Ніжняга Ноўгарада, Растова-на-Доне, Пяцігорска, Санкт-Пецярбурга. У Мінск яна прыбудзе з Калінінграда.

У чацвер а 18 гадзіне мошчы ўрачыста сустрэне Свята-Нікольскі сабор Бабруйска, дзе яны будуць знаходзіцца да раніцы 29 чэрвеня. У суботу а 11 гадзіне святыня прыбудзе ў Мінск, у храм іконы «Усіх тужлівых Радасць» (вул. Прытыцкага, 65). 1 ліпеня а 9 гадзіне раніцы мошчы сустрэне Свята-Пятра-Паўлаўскі сабор Гомеля, дзе яны прабудуць да 17 гадзін наступнага дня. З вечара 2 ліпеня да 4 гадзін раніцы 4 ліпеня мошчы будуць знаходзіцца ў саборы святога Архістратыга Міхаіла горада Мазыра, пасля чаго адправяцца ў Кіеў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЗАВЯРШЫЎСЯ XV СУСВЕТНЫ КАНГРЭС РУСКАЙ ПРЭСЫ

XV Сусветны кангрэс рускай прэсы завяршыў сваю работу ў Беларусі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Сусветны кангрэс рускай прэсы — традыцыйная сустрэча кіраўнікоў і журналістаў рускамоўных СМІ замежжа. У 2013 годзе гэты прадстаўнічы форум з 19 па 23 чэрвеня прымала Беларусь.

Форум аб'яднаў больш за 200 прадстаўнікоў рускіх дыяспар прыкладна 60 краін — галоўных рэдактараў, выдаўцоў і вядучых журналістаў рускага замежжа.

У адкрыцці пленарнага пасяджэння ў Нацыянальнай бібліятэцы ўзяў удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

На секцыях кангрэса яго ўдзельнікі абмеркавалі найбольш важныя аспекты ўплыву новых медыя на становішча традыцыйных рускіх СМІ за мяжой. Далей праграмай кангрэса было прадугледжана наведванне Нясвіжа, Брэсцкай крэпасці, дзе ў ноч на 22 чэрвеня эксперты далучыліся да памятных мерапрыемстваў, прысвечаных пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнікі форуму пабывалі таксама ў Нацыянальным парку «Белавежская пушча». Мяркуецца, што наступны кангрэс пройдзе ў Кітаі. У Беларусі форум прайшоў пры падтрымцы інфармацыйнага агенцтва Расіі ИТАР-ТАСС, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства замежных спраў і іншых органаў дзяржаўнага кіравання.

ПРАКАВЕТНАЕ

КУПАЛЬСКАЯ ВЕРШНІЦА

З надыходам самых доўгіх летніх дзён (і, адпаведна, самых кароткіх ночак) у Беларусі пачалі ладзіць Купалле. На беразе ракі Дрысы вакол купальскага вогнішча вадзіла карагоды моладзь з Наваполацка. На адным з азёрных астравоў на Лепельшчыне не сціхалі песні-купалінкі студэнтаў са сталіцы. Традыцыйны купальскі абход дваroў і ігрышчы на старажытным замчышчы зладзілі жыхары пасёлка Ракаў Валожынскага раёна. А ў музеі архітэктуры і побыту пад Мінскам у рамках купальскага свята прайшоў фэст фальклорных калектываў Міншчыны. Адметнасцю свята стала шэсце, якое ўзначальвала Купалінка на прыгожым белым кані (на фотаздымку). СТАР. 3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сустрэча без абцасаў

«З ТАКІМ СЫНАМ Я НЕ МЕЛА ПРАВА БЫЦЬ СЛАБАЙ»

Памятаеце прытчу пра дзвюх жабак, якія зваліліся ў жбанок з малаком? Адна з іх апусціла лапкі і адразу ж патанула. А другая так актыўна боўталася, што ўзбіла масла і выскачыла са жбанка. Сур'ёзнае выпрабаванне ў свой час жыццё паслала і Валянціне ВАЙЦЯШОНАК з Заслаўя: заўчасна забрала ў яе самых дарагіх людзей. Спачатку мужа, затым — сына. Тым не менш, мая гераіня, якая сёння ўзначальвае адкрытае акцыянернае таварыства «Заслаўе-тур» і з'яўляецца гаспадыняй кавярні ў беларускім нацыянальным стылі, знайшла ў сабе сілы, каб выбрацца са «жбанка» і рухацца далей. Яе гісторыя, лічу, можа стаць добрым урокам для многіх.

Фота Надзеі БУЖАН.

Пра тандэм, пачуццё локця і гром сярод яснага неба

Спачатку нічога не прадвяшчала буры. Гадавалі з мужам дзяцей, будаваліся. У пачатку 90-х, калі сыны падраслі, пачаліся цяжкія часы. Зарплаты сталі вельмі маленькія. Трэба было неяк выжываць. Вось і вырашылі арганізаваць сваю маленькую справу, якая карміла б сям'ю.

Сямейны бізнес быў звязаны з аптовым гандлем садавіной, грузаперавозкамі. У нас з мужам атрымаўся неблагі тандэм. Ён быў добрым выканаўцам. Я ж на сябе ўзяла арганізатарскія пытанні. У многім мне дапамаглі лідарскія задаткі і эканамічная адукацыя. Лічу, што кожны прадпрымальнік павінен ведаць асновы эканомікі, каб элементарна ўмець усё пралічыць.

У жыцці вельмі важна знайсці сваю палавінку. Каб муж быў не проста любімым чалавекам, але і сябрам, партнёрам. Нельга толькі на гармонах будаваць адносіны. Трываласць сям'і мацуецца менавіта на пачуцці локця, партнёрстве.

Як гром сярод яснага неба прагучала навіна, што старэйшы сын захварэў на рак. А бяда, кажуць, не ходзіць адна. Неўзабаве пайшоў з жыцця любімы муж. Я засталася з хворым дзіцем. Патрэбна было набываць дарагія лекі. Калі шчыра, думала, што не спраўлюся. Але Гасподзь дае столькі, колькі ты можаш несці. Гэта я цяпер дакладна ведаю. СТАР. 3

ЛІЧБА ДНЯ

Br4 млн 988 тыс. 338

склала налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў маі гэтага года, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Рэальная заработная плата (з улікам росту спажывецкіх цэн) у студзені-маі 2013 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 21,5%.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2013 г.

Долар ЗША	8730,00	▼
Еўра	11440,00	▼
Рас. руб.	265,50	▼
Укр. грыўня	1071,17	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 28°
Віцебск	+ 30°
Гомель	+ 29°
Гродна	+ 27°
Магілёў	+ 27°
Мінск	+ 27°

■ Надвор'е

За 30. Плюс моцныя ліўні

Сёння ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях навальнічныя дажджы, паведаміла рэдакцыі начальнік метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Святлана Рыбакова. Удзень пры навальніцах месцамі моцныя ліўні, град і шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература ўдзень 26—32 цяпла, у Мінску — плюс 30 градусаў. У сераду паўсюдна па краіне чакаюцца навальнічныя дажджы. Месцамі — моцныя ліўні, шквалісты вецер парывамі да 15—20 м/с, магчымы град. Тэмпература паветра ўначы плюс 16—21, а ўдзень — 27—32 цяпла. Толькі на захадзе краіны — плюс 20—26 градусаў.

Кароткачасовыя дажджы, навальніцы і месцамі моцныя ліўні чакаюцца і ў чацвер. У асобных раёнах магчымы град і шквалісты вецер парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы плюс 16—21, на захадзе краіны 12—15 цяпла. Удзень крыху пасвяжэе да 20—27 цяпла, але на ўсходзе яшчэ плюс 28—32 градусы.

Спякота сапраўды адпусціць толькі ў пятніцу. Аднак у цэнтральных і ўсходніх раёнах будзе ісці кароткачасовы дождж. На ўсходзе Беларусі месцамі моцныя ліўні, навальніцы, шквалісты вецер і нават град. Уначы чакаецца ўжо 10—16 цяпла, удзень — 20—27; аднак на ўсходзе ўначы плюс 17—20, а ўдзень — да 30 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БОЛЬШ ЗА 6 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛА Ў ВЫНІКУ ПАВОДАК У ІНДЫІ

Ахвярамі паводак на поўначы Індыі стала больш за 6,5 тыс. чалавек, паведамляюць інфармагенцтвы. Буйныя паводкі ў Індыі пачаліся ў выніку несціханых дажджоў, што выклікалі моцныя апоўзні. Каля 34 тыс. чалавек давялося эвакуіраваць з затопленых тэрыторый, аднак яшчэ каля 50 тыс. да гэтага часу знаходзяцца ў пацярпелых раёнах. Колькасць ахвяр можа павялічыцца. У пошукава-выратавальных работах бяруць удзел ратавальнікі і вайскоўцы, задзейнічаны ваенныя верталёты. Ваенным прыходзіцца ўручную аднаўляць змытыя паводкай масты, каб мясцовыя жыхары маглі патрапіць на бяспечныя тэрыторыі. Урад Індыі паабяцаў кампенсацыі сем'ям загінулых і пацярпелых. Так, пацярпелыя ад паводкі атрымаюць каля $850, сваякі ахвяр — $3400. Моцныя паводкі для Індыі не з'яўляюцца рэдкасцю. Штогод ад іх гінуць сотні чалавек.

ЗША ПРЫГРАЗІЛІ НАСТУПСТВАМІ МАСКВЕ І ПЕКІНУ

Дзяржаўны сакратар ЗША Джон Кэры прыгразіў Маскве і Пекіну «наступствамі» ў адносінах з Вашынгтонам за ігнараванне патрабаванняў аб экстрадыцыі былога супрацоўніка ЦРУ Эдварда Сноўдэна, які абвінавачваецца на радзіме ў выдаванні сакрэтнай інфармацыі. Пра гэта паведамляе Agence France-Presse. Па словах Кэры, калі высветліцца, што Расія ці Кітай «наўмысна дазволілі сесці на борт самалёта» Сноўдэну, то гэта выкліча «глыбокае расчараванне». Гэтая акалічнасць, «безумоўна», паўплывае на адносіны паміж гэтымі краінамі і Вашынгтонам. Кэры нагадаў, што ЗША за апошнія два гады выдалі Расіі семярых зняволеных, і заклікаў выканаць прынцып узаемнасці. Раней ЗША таксама раскрытыкавалі ўлады Ганконга, які з'яўляецца аўтаномным раёнам у складзе КНР. Амерыканскае міністэрства юстыцыі падкрэсліла, што выканала ўсе працэдуры, неабходныя для экстрадыцыі Сноўдэна, аднак яму дазволілі спакойна пакінуць рэгіён.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЯПОНЦЫ РАСПРАЦАВАЛІ ВАКЦЫНУ АД ГРЫПУ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПЛАСТЫРА

Група японскіх навукоўцаў абвясціла аб распрацоўцы вакцыны супраць грыпу ў выглядзе пластыра, перадаюць інфармагенцтвы.

Пластыр-вакцына супраць грыпу мае дыяметр 1 сантыметр і складаецца з 250 мікраіголак. Кожная іголка выраблена з гіялуронавай кіслаты, а таксама спрэсаванага кампанента вакцыны супраць грыпу. Па словах навукоўцаў, эфектыўнасць пластыру-вакцыны параўнальная са звычайнай вакцынай-ін'екцыяй, якая ўжываецца ва ўсім свеце. Разам з тым падобны спосаб вакцынавання з'яўляецца абсалютна бязбольным у параўнанні з ін'екцыяй. Акрамя таго, ён просты ў выкарыстанні і выгадны з эканамічнага пункту гледжання. Пластыр ужо выпрабаваны на людзях. Сур'ёзных пабочных эфектаў новай вакцыны выяўлена не было.

■ Прыёмная кампанія-2013

БОЛЬШ ЯК 40 АБІТУРЫЕНТАЎ УЖО СЫШЛІ З ДЫСТАНЦЫІ

Сёння ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў ужо ваўсю ідзе апрацоўка работ удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Большая частка абітурыентаў «адстралялася» — у графіку ЦТ засталося ўсяго некалькі дысцыплін. А ў Расіі, між тым, падводзяць вынікі адзінага дзяржаўнага экзамену і робяць высновы на будучыню.

Традыцыйна экзамены праходзілі ў нашых суседзяў на фоне шматлікіх паведамленняў аб дапушчаных парушэннях. Напярэдадні ці нават за некалькі дзён да АДЭ ў сацыяльных сетках з'яўляліся экзаменацыйныя матэрыялы і адказы да іх, а выпускнікі выкладвалі ў інтэрнэт фатаграфіі сваіх заданняў. Але, на думку памочніка прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, экс-міністра адукацыі і навукі Андрэя Фурсенкі, сёлета павялічылася не колькасць саміх парушэнняў, а колькасць паведамленняў аб парушэннях на АДЭ, што, у сваю чаргу, з'яўляецца сведчаннем таго, што сістэма ацэнкі ведаў становіцца ўсё больш празрыстай.

Цяперашні кіраўнік адукацыйнага ведамства Дзмітрый Ліванаў паабяцаў, што тэхналогія здачы экзамену будзе ўдасканальвацца. У прыватнасці, міністр адукацыі заявіў, што плануецца ўвядзенне выснаў часткі экзамену — спачатку па англійскай мове, а затым і па іншых замежных мовах. Акрамя таго, адбудзецца паступовы пераход да камп'ютарнай здачы экзамену — спачатку па інфарматыцы, а затым і па іншых прадметах, што дазволіць знізіць рызыку з'яўлення ў інтэрнэце экзаменацыйных матэрыялаў. Да слова, у 2013 годзе 100 балаў па матэматыцы атрымалі 500 расійскіх школьнікаў. А не здалі АДЭ па матэматыцы 7,6 працэнта выпускнікоў. Напрыклад, кожны пяты выпускнік не справіўся з наступнымі элементарнымі задачамі:

«На запраўцы кліент аддаў касіру 1000 рублёў і заплаціў 18 літраў бензіну па цане 31 рубель 50 капеек. Якую здачу ён павінен атрымаць ад касіра?» СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

■ Блізкая ўлада

МЕДЫК, ПАЦЫЕНТ І ПРАВАВАЯ БАЗА

У сувязі са змяненнямі і дапаўненнямі ў закон «Аб ахове здароўя», якія цяпер рыхтуюцца Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, члены пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы пабывалі ў Гродне, дзе наведалі шэраг медустаноў, а потым разам з мясцовымі спецыялістамі абмеркавалі праблемныя пытанні і спосабы іх вырашэння.

— Час не стаіць на месцы, і наша заканадаўства павінна адпавядаць дынамічным змяненням у грамадстве. Патрабуецца дэтальны маніторынг правапрымяняльнай практыкі, прагназаванне наступстваў тых рашэнняў, якія прымаюцца, — адзначыў **старшыня пастаяннай парламенцкай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Аляксандр ЦАЦОХА**, запрашаючы калег да адкрытай дзелавой размовы.

Такой яна і атрымалася. У прыватнасці, **галоўны ўрач гарадской паліклінікі № 1 г. Гродна Сяргей СОЎЦА** пераканаўчы, што дэмаграфічная бяспека краіны найперш залежыць ад работы медыцынскай службы пярвічнага звяна. Гэта самая масавая і вызначальная структура ў пытаннях ранняга выяўлення захворванняў і іх прафілактыкі. Таму павінна быць прыярытэтнасць яе развіцця ў дзяржаўным маштабе. У многіх краінах, каб атрымаць права працаваць у пярвічным звяне (напрыклад, сямейным урачом), доктар павінен ад пяці да дзесяці гадоў стажыравацца ў розных аддзяленнях стацыянараў. І толькі потым яго могуць дапусціць да самастойнай працы ў пярвічным звяне. У нас наадварот. У паліклінікі прыходзяць маладыя, нявопытныя ўрачы і, адпрацаваўшы два-тры гады, уладкоўваюцца ў стацыянары альбо ад'язджаюць за мяжу. Гэтую праблему, лічыць Сяргей Соўца,трэба вырашаць на дзяржаўным узроўні, ствараючы ўмовы і прэферэнцыі для ўрачоў і медсёстраў, якія б дазволілі зацікавіць іх у працяглай, пастаяннай рабоце ў медыцынскай службе пярвічнага звяна.

Вельмі важна таксама аб'яднаць усе лакальныя камп'ютарныя сістэмы розных лячэбных устаноў у адзіную інфармацыйную сістэму Міністэрства аховы здароўя. Інакш мы ніколі цалкам не вырашым пытанне вядзення медыцынскіх картак і гісторый хвароб у электронным выглядзе, адзначае **намеснік старшыні пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валянцін МІЛАШЭЎСКІ.**

Дарэчы, пакуль заканадаўствам не вырашана пытанне аб праве медустаноў адмаўляцца ад папяровага носьбіта медыцынскай інфармацыі, звяртае ўвагу **галоўны ўрач Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Святаслаў САВІЦКІ**. Таму, хаця і ёсць магчымасць вядзення электроннай амбулаторнай карткі і гісторыі хваробы, у медустановах па-ранейшаму вымушаны карыстацца ў тым ліку і «папяровым» спосабам.

Змяненні ў законе «Аб ахове здароўя» закрануць розныя кірункі медыцынскай галіны (ахова мацярынства і дзяцінства, арганізацыі правядзення прафілактычных мерапрыемстваў), а таксама такое паняцце, як урачэбная тайна.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Збіральнікі скарбаў

НЯСВІЖСКІЯ «ЗАЛАТЫЯ АПОСТАЛЫ»: НЕ ЗНАЙСЦІ, ДЫК УЯВІЦЬ

Інтэрактыўная экспазіцыя павінна з'явіцца ў музеі-запаведніку

Пра гэта паведаміў дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Сяргей Клімаў у дзень адкрыцця вечароў Вялікага тэатра, што прайшлі ў выхадныя ў палацава-замкавым комплексе. Прынамсі, прыватная кампанія з Бельгіі прапаноўвае зрабіць «пад ключ» экспазіцыю пад назвай «Легенды Нясвіжа: 12 апосталаў» з новымі інтэрактыўнымі формамі.

— Існуюць кампаніі, якія робяць экспазіцыі «пад ключ». Нам удалося выйсці на кампанію, якая займаецца шклом з 1826 года, прыкладна 30 працэнтаў іх прадукцыі — музейныя вітрыны і абсталяванне (асвятленне, сігналізацыя, супрацьпажарныя меры), — патлумачыў Сяргей Клімаў. — Яны ўжо паставілі свае вітрыны ў 1200 музеяў свету, сярод якіх «Метрапалітэн», «Луўр», «Эрмітаж». Нас зацікавіла тое, што яны атрымліваюць ідэю і пачынаюць з ёй працаваць, каб ажыццявіць пры дапамозе сучасных сродкаў. Безумоўна, канцэпцыю і тэхнічнае заданне пішам мы. Яны прапаноўваюць варыянт, як гэта прадставіць гледачу. Зараз мы ў стадыі перагавораў па гэтым праекце. Гэта кампанія найбольш значная з усіх кандыдатаў. Але, тым не менш, мы абвесцім тэндар і выберам лепшых.

Падчас спектакля «Лебядзінае возера».

Фота БЕЛТА.

У бліжэйшы час у Нясвіжскім палацава-замкавым комплексе павінны з'явіцца 3 новыя экспазіцыі. Ужо ажыццявілі рэканструкцыю калекцыі ў ратушы — дзеля гэтага набылі калекцыю бытавых прадметаў у прыватнага калекцыянера. Паводле слоў дырэктара, музей не стаіць на месцы, развіваецца, зарабляе сам і атрымлівае фінансаванне з дзяржаўных крыніц:

— Былі размовы пра тое, каб мы захавалі 50 працэнтаў фінансавання дзяржавай і яшчэ 50 працэнтаў зараблялі самі, як некаторыя музеі за мяжой. Зараз фактычна так і атрымліваецца. У нас добры заробак. Але да тых грошай, якія выдаткоўвае дзяржава, мы яшчэ столькі ж укладваем у развіццё музея самі. Купляем абсталяванне — напрыклад, музейныя вітрыны. Фактычна мы выйшлі на 70 працэнтаў акупляльнасці — гэта ў сусветных маштабах на ўзроўні «Луўра», «Эрмітажа». Пакуль нам выдаткоўваюць фінансаванне з тым, каб захаваць калектыў і даць магчымасць музею развівацца. У нас вялікі паток турыстаў (больш за 10 тысяч наведвальнікаў), хоць мы і думалі, што гэта будзе толькі напачатку пасля адкрыцця. Але ажыятаж захоўваецца, увесь час у нас экскурсійныя групы, асабліва шмат іх у выхадныя дні. На жаль, людзі не хочуць слухаць нашых парад, каб больш прыязджалі сярод тыдня. Але ж і ў будныя дні ў нас ёсць турысты.

Цяпер у музеі «Нясвіж» акрамя экскурсій праходзіць шмат розных мерапрыемстваў. Кожную суботу і нядзелю ў палацы Радзівілаў гучыць жывая музыка — дапамагаюць партнёры з ансамбля «Кантабіле». Іх можна паслухаць у капліцы і сталовай зале, і гэта ўключана ў кошт квітка. Дарэчы, капліцу не так даўно асвяцілі, і цяпер у ёй могуць праходзіць набажэнствы. І калі хто плануе шлюбную цырымонію ў тэатральнай зале палаца, то могуць дамовіцца і пра вянчанне. Але пакуль такіх замоў яшчэ не было.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Нясвіж — Мінск

■

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ» З МІНІСТРАМ ЖКГ

На гэтым тыдні ў рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» **з міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Віктаравічам ШОРАЦАМ**.

Ці будуць сёлета расці тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі? Якія віды работ пры капрамонце павінны аплачваць самі жыльцы? Калі ў жыроўцы з'явіцца графа, якая будзе «расшыфроўваць» тэхпаслугі? Колькі будзе каштаваць арэнднае жыллё? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Папярэднія пытанні можна задаваць па тэлефонах **(8-017) 287 18 29 і (8-017) 287 18 69.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

МАХЛЯРЫ РАССЫЛАЮЦЬ СМС

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ААТ «ААБ Беларусбанк» папярэджвае сваіх кліентаў аб махлярскай рассылцы карыстальнікам плацежных картак СМС ад імя банка, паведамляе БЕЛТА. «Да ўвагі трымальнікаў плацежных картак нашага банка: калі вам прыйшло СМС з інфармацыяй, што картка заблакіравана, і просьбай перазваніць па n-аму нумару, рэкамендуем звярнуцца ў банк па месцы адкрыцця рахунку для высвятлення сітуацыі. Гэта могуць быць махлярскія дзеянні. Наш банк ніякіх СМС не адпраўляў», — папярэджваюць у Беларусбанку. Банк таксама просіць усіх, хто сутыкнуўся з такой рассылкай, паведамляць пра яе ў кантакт-цэнтр Беларусбанка па нумары 147.

СТРАЛОК ЗАТРЫМАНЫ

У суботу мінчанка патэлефанавала ў міліцыю і паведаміла, што па Партызанскім праспекце імчыць машына, з якой страляюць па людзях. У выніку абстрэлу пацярпелі трое. Хлопец 1997 нараджэння і дзве маладыя жанчыны 1990 і 1982 гадоў нараджэння з раненнямі шпіталізаваны ў бальніцу. Іх жыццю, як сведчаць медыкі, нічога не пагражае.

Злачынства было здзейснена на прыпынку грамадскага транспарту ў раёне станцыі метро «Партызанская». Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік упраўлення СК па горадзе Мінску Аляксандр ГЕРАСІМАЎ**, мяркуемы аўтамабіль, які з'ехаў з месца здарэння, знайшлі на тэрыторыі Мінска ў ноч на 23 чэрвеня. Чацвёра грамадзян, якія знаходзіліся ў салоне, затрыманы. Па месцы жыхарства аднаго з іх — 29-гадовага раней двойчы судзімага мінчаніна — канфіскаваны пнеўматычны пісталет. Падазроны знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання. Затрыманыя разам з ім маладыя людзі даюць паказанні, яны ў адпаведнасці з заканадаўствам адпушчаны пад абавязацельства аб яўцы. Следства пераканаўча просіць грамадзян, якія з'яўляюцца сведкамі гэтага злачынства, патэлефанаваць па наступных тэлефонах: (017) 340 02 02, (017) 395 50 31 або 102. Канфідэнцыйнасць гарантуецца.

Надзея ПАЎЛАВА.

ЛЮДЗІ НЕ ХВАРЭЮЦЬ, АДНАК ПАВІННЫ БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ

У вёсцы Чапунь Іўеўскага раёна на адным з прыватных падворкаў пацверджана захворванне свіней на афрыканскую чуму. На адпаведнай адміністрацыйнай тэрыторыі ўстаноўлены каранцін і ажыццяўляецца комплекс мерапрыемстваў, каб ліквідаваць асцар інфекцыі і не дапусціць распаўсюджвання захворвання жывёлы, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка аддзела ветэрынарыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Тадэвуш ПАЛЬГУЙ.

На афрыканскую чуму хварэюць толькі свойскія і дзікія свінні, для іншых відаў жывёл пагрозы няма. Для чалавека афрыканская чума свіней таксама не ўяўляе небяспекі. Пры гэтым Тадэвуш Пальгуй нагадвае правілы, якія павінны выконваць людзі дзеля таго, каб захаваць здароўе свіней і пазбегнуць узнікнення і распаўсюджвання інфекцыі. Трэба ўтрымліваць пагалоўе ў закрытых памяшканнях, не дапускаць свабоднага выгулу свіней, а таксама наведвання асабістых падсобных гаспадарак пабочнымі людзьмі. Пры гэтым нельга завозіць свіней з іншых тэрыторый без узгаднення з дзяржаўнай ветэрынарнай службай. Для кармлення жывёлы неабходна выкарыстоўваць толькі камбікармы, вырабленыя на беларускіх прадпрыемствах камбікормавай прамысловасці; нельга прымяняць харчовыя адходы.

Якія чакаюцца наступствы хваробы свіней на адным з падворкаў у вёсцы Чупань для іншых сялянскіх падворкаў у наваколлі? З гэтым пытаннем карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да **галоўнага ветэрынарнага інспектара Іўеўскага раёна Часлава ХАЦЯНОВІЧА**, аднак атрымаць нейкую інфармацыю не ўдалося. Часлаў Сяргеевіч папрасіў патэлефанаваць пазней, а пакуль трэба разабрацца ў сітуацыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК, Сяргей КУРКАЧ.

МІНІМІЗАВАЦЬ ПАКАРАННЕ НЕ АТРЫМАЛАСЯ

Пры атрыманні хабару супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі намесніка старшыні суда Кастрычніцкага раёна г. Магілёва.

Як паведамляюць у прэс-службе КДБ, грашовае ўзнагароджанне ў памеры 2,7 тысячы долараў затрыманаму перадаваў адвакат юрыдычнай кансультацыі Кастрычніцкага раёна за вынясенне станоўчага выніку па крымінальнай справе ў дачыненні да сваёй падабараннай і мінімізацыю магчымага пакарання. Абодва знаходзяцца пад вартай. Заведзены крымінальныя справы — за атрыманне і дачу хабару.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ГАРЭЛКА ПАДАРАЖЭ

Гранічныя мінімальныя адпускныя і рознічныя цэны на алкаголь мацункам вышэй за 28 градусаў у ліпені вырастуць больш як на 25 працэнтаў.

Гэта прадугледжана праектам пастановы, што распрацоўваецца Мінэканомікі, паведамілі БЕЛТА ў міністэрстве. «Плануецца, што пастанова ўступіць у сілу ў ліпені», — паведамілі ў міністэрстве, у той жа час дадаўшы, што канкрэтная дата пачатку дзеяння дакумента пакуль невядома.

...СЫШЛІ З ДЫСТАНЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Кілаграм клубніц каштуе 75 рублёў. Маці купіла 2 кг 150 грамаў клубніц. Колькі рублёў здачы яна павінна атрымаць з 200 рублёў?».

Тым часам закрытая выбарачная праверка высакабальных і стабальных работ АДЭ выявіла парушэнні больш чым у палове выпадкаў. З 1,36 тысячы пераправерэных тэстаў амаль у 11 працэнтаў удзельнікаў экзамену быў завышаны выніковы бал. А ўвогуле сур'ёзныя парушэнні былі выяўлены ў 77% пераправерэных работ.

У Беларусі цэнтралізаванае тэсціраванне па матэматыцы ўжо таксама прайшло. Але яго вынікі стануць вядомыя бліжэй да канца чэрвеня. З тэсціравання па матэматыцы былі выдалены 7 чалавек. Двое — за шпаргалкі, астатнія — за мабільныя тэлефоны і навушнікі.

«Званок сябру на ЦТ цалкам выключаны, бо прадыктаваць умовы задачы і дачакацца правільнага адказу ніхто на дасць. Цэнтралізаванае тэсціраванне — не тэлевізійная перадача і не латарэя...»

— Хачу падкрэсліць, што размова не ідзе пра спробы скарыстацца мабільным тэлефонам для атрымання падказкі звонку, — тлумачыць дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў. — Справа ў тым, што ў нашай сітуацыі званок сябру цалкам выключаны, бо прадыктаваць умовы задачы і дачакацца правільнага адказу ніхто на дасць. Цэнтралізаванае тэсціраванне — не тэлевізійная перадача і не латарэя. Як правіла, прысутнасць мабільнага тэлефона ў экзаменацыйнай аўдыторыі ўстанаўліваецца пасля таго, як той зазвінеў у абітурыента ў кішэні. Яны іх нават не адключаюць! Усе парушальнікі правіл ЦТ пазбавіліся права ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі сёлета. Просьбы здаць мабільныя тэлефоны неаднаразова гучаць і на ўваходзе ў пункт правядзення тэсціравання, і ў экзаменацыйнай аўдыторыі да таго, як распячатваюцца пакеты з матэрыяламі тэсціравання. Ніякіх «апошніх кітайскіх папярэджанняў» на экзамене быць проста не можа. І выяўленне мабільнага тэлефона падчас экзамену заўсёды азначае толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі без права пераздаць гэты прадмет у рэзервовы дзень.

Усяго па выніках здачы сямі дысцыплін за парушэнні на ЦТ быў адхілены 41 чалавек, з іх 18 — за наяўнасць мабільнага тэлефона. І 12 чалавек пакінулі аўдыторыю па стане здароўя.

Дарэчы, перарэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень будзе весціся з 27 чэрвеня да 1 ліпеня. Да здачы тэст-іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для таго, каб прапусціць экзамен (напрыклад, прад'явяць даведку пра сваю хваробу). Калі абітурыенты ўдзельнічалі ў ЦТ у асноўны дзень, але не змаглі дапісаць сваю работу з-за пагаршэння стану здароўя, яны таксама змогуць скарыстацца рэзервовым днём.

Рэгістрацыя для ўдзелу ў тэсціраванні ў рэзервовы дзень будзе ажыццяўляцца ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

З сабой трэба мець пропуск на тэсціраванне, якое было прапушчана, дакумент, які сведчыць асобу абітурыента, і дакумент, які пацвярджае ўважлівую прычыну няяўкі. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень (4 ліпеня) прызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну вучэбную дысцыпліну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Спорт

ГАРНЯКАМ СМАК ПЕРАМОГ ДАСПАДОБЫ

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра няпросты шлях беларусак да чвэрцьфіналу Еўрабаскета, адзінаццаціматчавую бяспройгрышную серыю салігорскага «Шахцёра» і поспех Максіма Мірнага ў пары напярэдадні Уімблдона.

1. Беларуская жаночая зборная па баскетболе выйшла ў чвэрцьфінал чэмпіянату Еўропы. У другім туры Еўрабаскета падапечныя Рымантаса Грыгаса атрымалі два паражэнні і адну перамогу. Спачатку беларускі даволі нечакана саступілі сербскім баскетбалісткам з лікам 48:54. На другі матч нашы дзяўчаты выйшлі цалкам настроеныя на перамогу і без праблем расправіліся з брытанкамі — 71:61. З пункту гледжання турнірных перспектыў гэтая сустрэча мела стратэгічнае значэнне. Без перамогі над брытанкамі беларускім баскетбалісткам, мякка кажучы, было б складана разлічваць на чвэрцьфінал. Бо напярэдадні заставалася сапраўднае выпрабаванне — матч супраць чэмпіёнак Еўропы 2009 года, французанак. І фаварыткі гэтай сустрэчы пацвердзілі свой статус, упэўнена перайграўшы нашых дзяўчат — 58:50. Падапечныя Рымантаса Грыгаса толькі аднойчы падабраліся да сваіх апанентак, у сярэдзіне трэцяй чвэрці скараціўшы адставанне да двухачкоў. Пасля — разрыў толькі павялічваўся.

Такім чынам, беларускі занялі трэцяе месца ў сваёй групе і ў чвэрцьфінале пазмагаюцца з камандай, якая зойме другое месца ў групе Е, — Іспаніяй ці Турцыяй.

2. Салігорскі «Шахцёр» ужо на працягу адзінаццаці матчаў не ведае паражэнняў. Пачынаючы з трэцяга тура **чэмпіянату Беларусі па футболе**, падапечныя Уладзіміра Жураўля атрымалі дзевяць перамог і толькі двойчы згулялі ўнічыю. Апошняй ахвярай «гарнякоў» стаў «Гомель», які саступіў лідарам чэмпіянату з лікам 0:1. Адзіны гол у матчы аформіў форвард «Шахцёра» Дзмітрый Асіпенка.

Сярод іншых вынікаў чатырнаццатага раўнда адзначым нечакана лёгкую перамогу «Нафтана» над «Тарпеда-БелАЗ». Падапечныя Валерыя Стрыпейкіса ўсухую расправіліся з жодзінцамі — 3:0. Рэзультатыўнымі атакамі вылучыліся Ягор Зубовіч, Алег Шкабара і Аляксандр Алумона. Дарэчы, галоўны трэнер «Тарпеда» Ігар Крывушэнка вельмі рэзка пракаментаваў дзеянні сваіх футбалістаў: «Жахлівыя памылкі, асабліва на першых хвілінах. Пасля перапынку трохі змянілі гульню, але потым зноў паніклі. Не магу абвінаваціць хлопцаў у нежаданні, але ўзровень іх майстэрства выклікае ў мяне сапраўдны жах. Не столькі сапернік нас перайграў, колькі мы самі вінаватыя».

Другой перамогі запар дабіліся гульцы «Дынама-Мінск». У апошнім матчы мінчане перайгралі магілёўскі «Днепр» 2:1. Здаецца, новы трэнер «бела-сініх» Роберт Мааскант сапраўды ведае, у якім кірунку развіваць каманду.

3. Беларускі тэнісіст Максім Мірны ў пары з румынам Хорыяй Тэкау выйграў турнір у Хертагенбошы. Гэтыя спаборніцтвы на галандскай траве традыцыйна праводзяцца напярэдадні галоўнага старту лета — Уімблдона. У фінале беларуска-румынскі тандэм упэўнена перайграў немцаў Андрэ Бегемана і Марціна Эмрыха — 6:3, 7:6. Для алімпійскага чэмпіёна Лондана ў міксце Максіма Мірнага гэты тытул стаў 47-м у кар'еры і другім здабытым у пары з румынскім напарнікам.

На Уімблдоне Мірны і Тэкау атрымалі сёмы нумар пасеву і свой першы матч правядуць супраць нямецка-аўстрыйскага дуэта Дамініка Мефферта і Філіпа Освальда.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

УПАЎ МОТАПЛАНЁР

■ Здарэнне

Пра тое, што паблізу вёскі Брускоўшчына Маладзечанскага раёна ўпаў самалёт, на станцыю хуткай медыцынскай дапамогі ў сярэдзіне дня паведаміў відавочца. Фельчар звязалася з выратавальнікамі. Аднак іх дапамога не спатрэбілася.

— На месцы высветлілася, што з вышыні каля 50 метраў упаў аднаматорны мотапланёр, які належаў 57-гадоваму мужчыну, што ў прыватным парадку дае ўрокі пілатавання. У момант падзення за штурвалам знаходзіўся 49-гадовы навучэнец, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — У выніку пацярпелі абодва мужчыны. Гаспадар мотапланёра атрымаў адкрыты пералом левай галёнкі, закрыты пералом левага пляча, пералом носа, гематому век. У навучэнца зафіксавалі адкрыты пералом левай галёнкі, ірваную рану ніжняй сківіцы, удар правай кісці, рану лба. Пацярпелых шпіталізавалі ў траўматалагічнае аддзяленне Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы. Прычыны здарэння высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Погляд

СКАРЫСТАЦЦА «РАСІЙСКІМ ДАВОСАМ»



20—22 чэрвеня 2013 года ў Санкт-Пецярбургу адбыўся Міжнародны эканамічны форум. Гэты форум з'яўляецца расійскім аналагам штогадовага форуму ў Давосе. На ім збіраецца каля 5000 прадстаўнікоў палітычных, навуковых і дзелавых колаў, прадстаўнікоў грамадскасці і сродкаў масавай інфармацыі з усяго свету. Адметнасцю форуму стала асабістая прысутнасць на ім Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Акрамя гэтага, звычайна прысутнічаюць і прадстаўнікі іншых дзяржаў у падобным рангу.

Так, на сёлетнім форуме прысутнічала канцлер Германіі Ангела Меркель. Асаблівым мерапрыемства гэтага года было і з пункту гледжання маючага адбыцца саміту «вялікай дваццаткі», які пройдзе 5—6 верасня 2013 года ў Санкт-Пецярбургу. Паколькі Расія сёлета з'яўляецца старшынёй у G-20, было вырашана правесці ў рамках форуму дзелавы саміт. Як адзначыў у сваім выступленні Уладзімір Пуцін, ён разлічвае, што ўдзельнікі саміту падрыхтуюць да сустрэчы «дваццаткі» ў Санкт-Пецярбургу канкрэтныя прапановы па стымуляванні сусветнай эканомікі, стварэнні працоўных месцаў, удасканаленні валютна-фінансавай сістэмы.

У рамках форуму прайшлі разнастайныя мерапрыемствы. Неабходнасць правядзення тэледэбатаў «БРІКС — партнёры або выпадковыя спадарожнікі?» была абгрунтавана тым, што па апошніх прагнозах уклад краін, якія развіваюцца, у рост сусветнай эканомікі ў 2012—2017 гадах дасягне 74%. За 30 гадоў ён павялічыўся амаль у 2,5 раза, а тэмпы росту краін, якія развіваюцца, ужо больш як 30 гадоў перавышаюць аналагічныя паказчыкі развітых краін. Сяргей Сторчак, намеснік міністра фінансаў Расійскай Федэрацыі, падзяліўся сваім прагнозам па даце стварэння банка БРІКС. На яго думку, можна чакаць пачатку работы гэтай вельмі важнай фінансавай структуры ў 2015 годзе.

Цікава таксама, што прэзідэнт China Investment Corporation Гао Сіцын паведаміў публіцы аб тым, што ў апошнія некалькі гадоў супрацоўніцтва з Расіяй стала значна прасцей вырашаць праблемы, звязаныя з інвестыцыямі, чым у многіх іншых краінах. Гэтую заяву можна лічыць своеасаблівым намёкам ЕС і ЗША, у якія Кітай хоча праінвеставаць вялізныя сродкі, але кітайскія бізнесмены пастаянна натыкаюцца на сур'ёзныя перашкоды з боку ўрадаў заходніх краін, якія асцерагаюцца росту ўплыву Кітая.

Практычнай ілюстрацыяй слоў Гао Сіцына стаў заключаны на форуме кантракт «Раснафты». Яго сума сапраўды ўражвае і не можа быць супастаўнай ні з адным з кантрактаў, заключаным кітайцамі ў ЗША або на тэрыторыі любой дзяржавы ЕС. «Раснафта» будзе пастаўляць расійскую нафту ў КНР 25 гадоў. Агульны кошт гэтай нафты ацэньваецца ў 270 мільярдаў долараў ЗША.

Адзначаючы асаблівасці супрацоўніцтва Расіі з Кітаем, нельга не адзначыць і сустрэчу Уладзіміра Пуціна падчас форуму з першым намеснікам прэм'ера Дзяржаўнага Савета Кітайскай Народнай Рэспублікі Чжанам Гаолі. На ёй, акрамя перспектыў развіцця ўзаемадзеяння ў нафтавай сферы, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі адзначыў, што вялікія надзеі Расія звязвае з супрацоўніцтвам кітайскіх партнёраў з такімі кампаніямі, як «Газпрам» і «НОВАТЭК» у газавай сферы. Усё гэта буйнамаштабныя, доўгатэрміновыя праекты, разлічаныя на дзесяцігоддзі наперад. А Чжан Гаолі, у сваю чаргу, нагадаў, што пасля ўступлення на пасаду Старшыні КНР Сі Цзіньпін выбраў Расію для свайго першага міжнароднага візіту.

Цікавымі для Беларусі былі і дэбаты на тэму «Уступленне ў СГА і павышэнне канкурэнтаздольнасці расійскай прамысловасці», якія прайшлі 21 чэрвеня. Міністр эканамічнага развіцця РФ Андрэй Белавусаў прызнаў, што магчымасці, на якія Расія разлічвала ў рамках сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА), не рэалізаваны. З-за вельмі доўгіх перагавораў умовы далучэння аказаліся менш выгаднымі. Генеральны дырэктар аб'яднанай кампаніі «РУСАЛ» Алег Дэрыпаска параўнаў СГА з «басейнам з акуламі»: хтосьці ў ім будзе непазбежна з'едзены, іншыя ж навучацца плаваць. Адным з наступстваў уступлення Расіі ў СГА стаў прыток імпарту, але не складнікаў і не кампанентаў, якія вырабляюцца ў Расіі, а гатовай прадукцыі. У такой сітуацыі давядзецца не толькі змагацца за сваё месца ў сусветнай эканоміцы, але і цалкам спадзявацца на свае рэсурсы. Генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Поўначсталь» Аляксей Мардашоў адзначыў, што наступствы ўступлення ў СГА для Расіі маюць больш доўгатэрміновы характар. На яго думку, уступленне ў СГА дазваляе расійскаму боку выкарыстоўваць інструменты антыдэмпінгавых разглядаў сусветнай арганізацыі, больш эфектыўна абараняць свае інтарэсы, адчуваць сябе больш упэўнена і спакойна.

Форум быў выкарыстаны для наладжвання дзелавых кантактаў і беларускім бокам. Так, 21 чэрвеня падчас яго правядзення адбылася сустрэча першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі з віцэ-прэзідэнтам найбуйнейшай фондавай біржы Германіі «Deutsche Boerse» Андрэасам Пройсам. На ёй былі дасягнуты дамоўленасці аб візіце кіраўніцтва біржы ў Беларусь для вызначэння перспектыўных сумесных праектаў.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

Открытое акционерное общество «Радиотехника»
ПРОВОДИТ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ в заочной форме 5 июля 2013 года.

Повестка дня собрания:
1. Об утверждении для ОАО «Радиотехника» на 2013 год нового значения показателя по энергосбережению.

Собрание проводится в заочной форме с голосованием бюллетенем, заполненные бюллетени должны быть представлены в срок до 03.07.2013 по адресу: ул. Я. Колоса, д. 1, г. Ошмяны, 231103, Гродненская обл.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 05.07.2013, реестра — 25.06.2013.

Основание созыва внеочередного собрания — решение наблюдательного совета от 20.06.2013.

УНП 500227068

МІНСК — РАЗУМНЫ ГОРАД

Замежныя спецыялісты ацанілі праекты брэнда сталіцы

У межах міжнароднага фестывалю тэрытарыяльнага маркетынгу і брэндынгу OPEN, што прайшоў у Мінску 20 і 21 чэрвеня, адбылося пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Ад брэнда Мінска да брэнда Беларусі». Удзельнікі абмеркавалі існуючыя праекты сталічнай сімволікі і атрымалі парады ад замежных экспертаў.

На мерапрыемстве, што адбылося ў будынку Нацыянальнага гістарычнага музея, сабраліся вядучыя спецыялісты па меркетынгу з самых розных краін: Беларусі, Вялікабрытаніі, Расіі, ЗША, Іспаніі, Партугаліі, Нідэрландаў і многіх іншых. Спачатку свой праект брэнда Мінска прэзентавала брытанская кам-



Варыянт лагатыпа сталіцы ад студыі ldfix.by.

Прыклад брэнда Мінска ад кампаніі INSTID на розных носьбітах.

панія INSTID, якая летась у ліпені выйграла тэндар і займаецца распрацоўкай сталічнага брэнда. Менавіта па выніках яе працы і будзе створаны канчатковы варыянт стылістычнага афармлення Мінска.

Брытанскі праект заснаваны на прынцыпе «разумнага горада». Менавіта такой яны прапануюць пазіцыяніраваць беларускую сталіцу. «Мы задаліся пытаннем: які ж сённяшні Мінск? Чым ён адрозніваецца ад іншых? — патлумачыла **дырэктар кампаніі INSTID па даследаваннях Наталля ГРАНД.** — І прыйшлі да высновы, што Мінск — гэта горад розуму і інтэлекту. Гэта горад, які адрозніваецца ад іншых сваёй цягай да развіцця».

Вынікам працы кампаніі стане брэндбук — поўнае апісанне брэнда і яго прымянення на самых розных носьбітах. Першыя яго прыклады з'явіліся ў сеціве ўжо даволі даўно. Галоўныя колеры, якія ўжываюцца ў візуальным афармленні аб'ектаў, — белы і блакітны. Яны спалучаюцца і ў распрацаваным кампаніяй INSTID мінскім арнаменце. Усе візуальныя элементы могуць выкарыстоўвацца пры афармленні афіш, грамадскага транспарту, візітовак, дакументаў, пісьмовых прылад, кубкаў і многіх іншых прадметаў. Акрамя выключна візуальнага афармлення, брытанская кампанія займаецца праектам па стварэнні фірменных страў, мелодый і нават... паху Мінска. Гатовы брэндбук будзе прадстаўлены сталічнай аўдыторыі ў ліпені.

Пасля INSTID слова ўзяла грамадская ініцыятыва «Зборная Мінска па брэндзінгу», якая паралельна з брытанцамі распрацавала свае, альтэрнатыўныя праекты брэнда сталіцы. Стварэннем альтэрнатыўных варыянтаў займалася некалькі груп, многія ўдзельнікі якіх не з'яўляюцца прафесіяналамі ў брэндзінгу. Вынікам сталі тры праекты: «Мінск: калі ласка!» ад партала TUT.BY, «Nice to Minsk you!» ад брэндзінгавай кампаніі «Fabula» і «Неверагодны Мінск» ад студыі Idfix.by.

Варыянт брэнда ад кампаніі INSTID, што і будзе нарэшце прыменены ў сталіцы, у свой час выклікаў неадназначную рэакцыю мінчан у сеціве. Многія крытыкавалі канцэпцыю «разумнага горада». Пасяджэнне «круглага стала» было праведзена дзеля таго, каб мінчане і брытанцы нарэшце прыйшлі да паразумення. Аднак падчас абмеркавання праектаў удзельнікі часам ледзь не даходзілі да сапраўднай сваркі. Нарэшце, сваё слова сказала журы, складзенае з замежных спецыялістаў па брэндзінгу. Яны высока ацанілі ўсе варыянты, аднак адзначылі, што памылкай кампаніі INSTID быў нізкі ўзровень прыцягнення мінчан да стварэння ўласнага брэнда. Малаверагодна, што брытанцы будуць уносіць змены ў свой праект, бо да здачы брэндбука засталося зусім мала часу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

«З ТАКІМ СЫНАМ Я НЕ МЕЛА ПРАВА БЫЦЬ СЛАБАЙ»

ПРА СІЛУ ДУХУ, СЛЯДЫ І АДКАЗНАСЦЬ

Сын вельмі цяжка хварэў. 10 гадоў мы з ім змагаліся за жыццё. За гэты час навукова-даследчы інстытут анкалогіі стаў нашым другім домам. Я бачыла, як ламаліся дарослыя людзі. А сын не зламаўся. Нават калі ўжо не ўставаў з ложка, казаў мне: «Мама, усё будзе добра!» Чытаў у інтэрнэце пра рэстаранны бізнес, расказваў мне і тым самым набліжаў здзяйсненне маёй даўняй мары. Вось гэта сіла духу!

Побач з такім сынам я проста не мела права быць слабай. Для мяне ён і сёння — прыклад мужнасці і мудрасці. Калі дрэнна, думаю менавіта пра сына: што б ён мне сказаў, як бы падтрымаў.

Усім людзям, у якіх гора, хачу сказаць, каб яны не раскісалі, бо для дзяцей вельмі важна, калі побач моцныя бацькі. Магчыма, гэта прагучыць банальна, але ўсе мы рана ці позна пойдзем у лепшы свет. Таму трэба ўзяць сябе ў рукі і рабіць нават немагчымае. Бо каб плакаць ды намотваць соплі на кулак, вялікага розуму не трэба.

Майго сына не стала, калі яму было практычна 26 гадоў. Але я так удзячна лёсу, што ён у мяне быў. Бо тое, што ён у мяне быў, перавышае гора, якое я перажыла.

Калі мне было вельмі цяжка, я здымала абутак і басанож палола градкі. Зямля давала мне энергію. Таксама ездзіла ў Свята-

Елізавецінскі манастыр. Сядзела там і плакала... Пакуль Бог не ўзяў мяне на рукі. Памятаеце прытчу пра чалавека, які ішоў па жыцці і час ад часу азіраўся. Азіраўся і бачыў на пяску два ланцужкі слядоў: адзін — ад сваіх ног, другі — ад ног Госпада. Але аднойчы, калі ў яго здарылася вялікае гора, азірнуўся і ўбачыў толькі адзін ланцужок. Ён вельмі зажурыўся і спытаў Госпада: «Чаму ты пакінуў мяне, калі я больш за ўсё меў патрэбу ў Табе?». Гасподзь яму адказаў: «Таму што якраз у той час я нёс цябе на руках». Гэта пра мяне. Калі ўсё здавалася безнадзейным, Бог нёс мяне на руках. А пасля на дапамогу прыйшла работа. Я ж чалавек адказны: разумела, што, акрамя мяне, распачатыя справы ніхто не завершыць.

ПРА АФІЦЫЯНТАЎ, ЖЫЦЦЁВУЮ НЕАБХОДНАСЦЬ І ТУРЫСТАЎ

Вельмі люблю свой горад з яго няпростай гісторыяй. Тут захаваліся ўнікальныя помнікі: гарадзішча «Вал», былы кальвінскі збор, касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі... Ёсць некалькі цікавых музеяў: этнаграфічны комплекс «Млын», музей-дот, музей міфалогіі і лесу... Але нягледзячы на такую колькасць славутасцяў, у горадзе катастрафічна не хапала месца, дзе турысты маглі б «прызямліцца» пасля экскурсіі, перавырыць атрыманыя яркія ўражанні, абмяняцца думкамі, проста смачна паесці і прыгожа адпачыць.

Да таго, як у нашай сям'і здарылася гора, я была на бізнес-курсах у Літве. Мяне вельмі ўразіла стаўленне літоўцаў да сваёй культуры, побыту. У Вільні шмат нацыянальных рэстаранчыкаў. Заходзіш туды і разумееш, што табе рады. Усе афіцыянты, як адзін, прыветліва ўсміхаюцца. Такое адчуванне, што ты прыйшоў не ў рэстаран, а да іх дадому. У нас гэта, на жаль, рэдкасць. Часта прыходзіш некуды пасядзець, і хочацца проста памяняць афіцыянта... Вось у мяне і нарадзілася думка пабудаваць у гістарычнай частцы Заслаўя кавярню ў беларускім стылі, у якой можна было б размясціць турыстаў.

Праграмы прынцыпова праводзім на беларускай мове. Заўсёды выбачаюся перад гасцямі, што гавару па-руску, бо я — расіянка. Не разумею, як можна не любіць беларускую мову — яна ж такая прыгожая! Калі на фальклоры. Ладзім «Каляды», «Гуканне вясны», вяселлі ў беларускім стылі. Прафесійныя артысты прыцягваюць гасцей да беларускіх танцаў, песень. Людзі ў нас адчуваюць сябе сапраўднымі беларусамі. Сярод запісаў у кнізе водгукаў ёсць і такія: «Пасля таго, як пабылі тут, ганарымся, што мы беларусы».

Калі захварэў сын, мая мара ператварылася ў жыццёвую неабходнасць. Патрэбны былі вялікія грошы на лячэнне... Таму і адважылася на будаўніцтва «Шынка». Я вельмі ўдзячна тым людзям, якія ў мяне паверылі.

Крэдытавалася я ў Беларусбанку. Той час, калі трэба было аддаваць грошы, прыйшоўся якраз на сусветны фінансавы крызіс. Таму, самі разумееце, было нялёгка. Тры гады, што выплачвалі даўгі, даводзілася ў многім сябе абмяжоўваць. Але, дзякуй Богу, на днях мы ўсё ж такі канчаткова разлічыліся з банкам.

ПРА МОВУ, КРУПНІК І МЯШОК МУКІ

Акрамя ўтульнага інтэр'еру і нацыянальнай кухні, мы прапануем сваім наведвальнікам цікавыя праграмы, заснаваныя

б мяне паставілі ў рамкі, пэўна, вывучыла б мову. І гаварыла б. Добра ці дрэнна — гэта ўжо іншае пытанне.

Калі да мяне прыязджаюць людзі, частую іх старажытным беларускім напоем XVI стагоддзя. «Крупнік» — адна з нашых цікавінак. Гатую яго на травах, са спецыямі і мёдам. Калісьці я была вельмі добрай гаспадыняй. Мой муж любіў выпечку. Памятаю, мы куплялі пра запас мяшок мукі. Гэтага мяшка хапала на паўгода. Я пякла вельмі смачныя булкі. Цяпер ужо няма неабходнасці. Мой малодшы сын дапамагае мне развіваць сямейны бізнес, і мы, як правіла, ядзім у сваім «Шынку». У мяне тут працуе паварыха, якой я вельмі даражу. І наогул у маім узросце ўжо трэба менш есці *(смяецца)*.

Самая смачная ежа — гэта простая ежа, прыгатаваная ў добрым настроі. Бо праз ежу перадаюцца як станоўчыя, так і адмоўныя эмоцыі. Не трэба эканоміць на прыправах, яны павінны быць натуральнымі. Таксама вельмі важна мець пачуццё меры, каб не перасыпаць солі, спецый. Спецыі павінны толькі паляпшаць, а не псаваць смак. І наогул пачуццё меры неабходна не толькі на кухні, але і ў жыцці. Важна не пераходзіць межы дазволенага і не пакрыўдзіць некага. Перш чым нешта зрабіць, трэба падумаць, як бы ты адчуваў сябе на месцы іншага чалавека.

Не трэба баяцца нешта аддаць. Таму, хто дае, вяртаецца ў некалькі разоў больш. Гэта ад-

назначна. І не варта прывязвацца да матэрыяльнага. Няма нічога вечнага ў жыцці. У труне кішэні няма. Мы ўсе прыходзім у гэты свет голыя і сыходзім голыя.

ПРА «ПАНТЫ», ЖЫВЫ МУЗЕЙ І ДРЭННЫ НАСТРОЙ

Муж маёй італьянскай сяброўкі — рэстаратар. Таму калі я была ў іх у гасцях, ён вадзіў нас па самых розных рэстаранах. Мне вельмі спадабалася, што там гаспадары са сваімі дзецьмі і жонкамі падносяць ежу, пякуць піцу, разбіраюць рыбу на вачах у наведвальнікаў. У іх няма «пантоў».

Калі мы толькі пачыналі будавацца, даводзілася ўсю брудную работу рабіць сваімі рукамі. І сёння я не лічу для сябе ганебным памыць падлогу ў сваёй кавярні ці заварыць каву для гасцей. Я ад гэтага горшай не стану. Проста лішні раз займуся фізічнай працай.

Чалавек, у якога здейснілася запаветная мара, прыдумляе сабе новую мару (*усміхаецца*). Вось я, напрыклад, хачу пабудаваць жывы музей горада Заслаўя. Каб дзеці менш сядзелі за камп'ютарамі, а прыязджалі сюды. Іх наўрад ці зацікавіш гліняным асколкам вырабу X стагоддзя, а вось калі побач з ім будзе стаяць ганчарны круг... І ганчар пакажа, як нашы продкі выраблялі гаршчкі. І дазволіць дзецям паспрабаваць зрабіць нешта сваімі рукамі. Гэта, як мінімум, запомніцца. Як максімум, выхавае ў новага пакалення гонар за гісторыю сваёй радзімы, любоў да беларускай культуры і традыцый.

— Пад разгрузачнымі днямі звычайна разумеюць «галодныя» дні, калі ежу або не прымаюць наогул, або ўжываюць абмежаваны набор прадуктаў у абмежаванай колькасці. Такія «галодныя» дні не патрэбны, калі чалавек харчуецца правільна, не пераядае, кантралюе сваю вагу. Усё ж такі ў арганізме ўсё ўладкавана надзвычай мэтазгодна. На працягу дня неабходную энергію чалавек атрымлівае з ежы. Пры гэтым у печані адкладваецца невялікая «заначка» — 200-300 г глікагену, які будзе расходавацца на падтрымку работы ўсяго арганізма падчас сну. Да моманту абуджэння глікагену застаецца мала, і мы адчуваем пачуццё голаду — арганізм патрабуе «падхарчоўкі». Мы снедаем, потым абедаем, вячэраем — словам, падкідваем «дровы» ў сваю біяхімічную «топку». Калі гэтых «дроў» надта многа, арганізм будзе з іх рабіць запас у выглядзе тлушчавых адкладанняў. Так развіваецца атлусценне. І вось для людзей, якія пакутуюць ад атлусцення або маюць лішнюю вагу, рэкамендуюць правядзенне таго, што мы называем «разгрузачнымі днямі». Прызначаць правядзенне разгрузачных дзён, як і рэкамендаваць, што і ў якой колькасці неабходна ўжываць на працягу разгрузачнага дня, — прэрагатыва ўрача. Самастойна займацца падобнымі «разгрузкамі» я б не рэкамендавала. Любыя абмежаванні — гэта стрэс для арганізма. Таму невядома, што ў выніку чалавек атрымае: карысць ад страты пары соцень грамаў вагі ці шкоду ад стрэсу.

ЦІ МОЖНА ДЗІЦЯ ПАЗБАЎЛЯЦЬ МЯСА?

— А за што яму, беднаму, такія выпрабаванні? Чалавек — істота ўсяядная, такім яго запраграмавала прырода. Таму і раслінная, і жывёльная ежа яму неабходны для нармальнага росту і развіцця. У мясе ёсць паўнацэнныя бялкі з поўным наборам патрэбных арганізму амінакіслот, многія іншыя неабходныя рэчывы, уключаючы тлушчарастваральныя вітаміны. Усё гэта неабходна арганізму, які расце. А вось калі працэсы росту і выспявання спыняцца (прыкладна пасля 21 года), чалавек сам выбярэ, якога харчавання яму прытрымлівацца: ужываць дзьмухаўцы або нармальную адбіўную... з тымі ж дзьмухаўцамі.

ШТО БОЛЬШ НАШКОДЗІЦЬ ФІГУРЫ — МАРОЗІВА ЦІ ШАКАЛАД?

— У межах разумнага нічога фігуры не нашкодзіць. А вось калі аб'ядацца штодня, то ўсё будзе адкладвацца на баках. Лішні для арганізма кавалачак сыру вагой 30 г, калі яго ўжываць штодня, за год дадасць прыбаўку вагі ў 5 кг. Так што галоўнае — не пераядаць і больш рухацца. Тады ні марозіва, ні шакалад не страшныя.

Святлана БАРЫСЕНКА

НАЎМЫСНА ПАДПАЛІЎ ЖЫЛЛЁ БЫЛОЙ

■ Ну і ну!

Раніцай паступіла паведамленне пра пажар у кватэры на вуліцы Чыгуначнай у Салігорску. Тэлефанавала гаспадыня жылля, а ў здарэнні падазраецца былы сужэнец жанчыны.

— Абставіны гісторыі наступныя. Напярэдадні пажару жанчына і яе дачка знаходзіліся на лецішчы. На мабільны тэлефон гаспадыні кватэры пазваніў яе былы муж, з якім яны пражывалі сумесна — з пагрозамі падпаліць жыллё. Мужчына быў нападпітку, — распавялі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Ужо раніцай наступнага дня, вярнуўшыся дадому, жанчына знайшла ў кватэры сляды загарання. Агонь пашкодзіў мэблю, пазакурваў сцены ў кухні трохпакаёвай кватэры ў дзевяціпавярховым шматкватэрным жылым доме. Загаранне самастойна ліквідаваў былы сужэнец гаспадыні.

Сяргей РАСОЛЬКА

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость

Лот № 1.
Автомобиль ГАЗ 32213-408, 2008 года выпуска, рег. № АВ2641-2, начальная стоимость лота 86 528 361 рубль.

Лот № 2.
Погрузчик фронтальный ВМЕ-1560, 2008 года выпуска, рег. № 5689БЯ, начальная стоимость лота 223 419 330 рублей.

Лот № 3.
Трактор Беларус-82.1, 2008 года выпуска, рег. № 4496ВА, начальная стоимость лота 81 026 701 рубль.

Лот № 4.
Экскаватор ЕК-12-00, 2008 года выпуска, рег № 3786БЯ, начальная стоимость лота 639 882 177 рублей.

Лот № 5.
Грузовой спец. автокран КС-55727-1 МАЗ 630303 (гр. 25 т.), 2006 года выпуска, рег. № 6089-2, начальная стоимость лота 283 956 403 рубля;

Лот № 6.
Легковой автомобиль ВАЗ 21074, 2008 года выпуска, рег. № 3197ВЕ2, начальная стоимость лота 16 033 737 рублей.

Лот № 7.
Полуприцеп бортовой МАЗ-97580046, 2008 года выпуска, рег. № А0706А2, начальная стоимость лота 57 396 417 рублей;

Лот № 8.
Трактор Беларус 1221.2, 2008 года выпуска, рег. № 2583ИЯ2, начальная стоимость лота 201 658 402 рубля;

Лот № 9.
Прицеп МАЗ-857100-(010), 2009 года выпуска, рег. № А14492, начальная стоимость лота 54 643 807 рублей.

Лот № 10.
Автомобиль МАЗ-5551А2 (самосвал 10 т.), 2009 года выпуска, рег. № 995102, начальная стоимость лота 175 988 157 рублей.

Лот № 11.
Автомобиль ГАЗ-33104 (, 2008 года выпуска, рег. № АВ2688-2, начальная стоимость лота 82 995 879 рублей.

Собственник (владелец) имущества	ДКУСП «Верхнедвинская ПМК-44» (Витебская обл., г. Верхнедвинск, ул. Первомайская, 34, УНП 300460189).
Местонахождение имущества	Витебская область, г. Верхнедвинск, ул. Первомайская, 34. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к ответственному хранителю имущества – директору ДКУСП «Верхнедвинская ПМК-44» Урбану Олегу Сергеевичу (раб.тел. № 80215153252, 80333244106, 80215152156).
Наличие обременений	Залог ОАО «Белагропромбанк».
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 22 июля 2013 года в 14.00
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс: (0212) 491342, (029) 1502410 Старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел. (0212) 491343
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 **не позднее 14.00 22 июля 2013 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

■ Чалавек — чалавеку

ЧАРОЎНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

Не вам казаць — не ўсе ягады з нашага лецішча трапляюць нам, гаспадарам, у рот. Альбо ў нашы слоікі. І так год ад года...
Вы можаце падумаць, што мы нядбайныя гаспадары — збіраем іх не ў пару ці збіраем не ўсе... Вось апошняе — праўда.

Нашы палеткі ўпадабалі чужынцы. І іх не спыняе той факт, што лецішча знаходзіцца далёка ад дарогі, бо яны да яго не дахадзяць, а... далятаюць.

Птушыны дэсант пачынае высаджвацца ледзь не з першай ягады, і нахабству яго можна толькі пазайздросціць. Бо крычы не крычы — не чуе (сам у адказ яшчэ голас падасць). І рукою «захопніка» пакратаць можна: табе крыху страшнавата, а яму, падобна, нікольк!..

Карацей, чарэшню мы «здалі» адразу — дрэва высокае, чалавеку не дацягнуцца, а вось птушкам — сапраўдны баль: дзень, два, тры — і на галінках толькі белыя костачкі.

А вось суніцы і бружмель звычайна пільнуем: хуценька збіраем (часам недаспелае), бо ідзе спаборніцтва: хто каго — паміж людзьмі і крылатымі. Лік часцей на карысць апошніх.

Але ж чалавек, як істота разумная, мірыцца з гэтым не хоча, ён шукае выйсце. І знайсці яго дапамагаюць сучасныя тэхналогіі. У мяне як гаспадыні-«плюшкіна» (а раптам спатрэбіцца?) спачатку пайшлі ў ход магнітафонныя касеты: нарэзала плёнку стужкамі, сабрала іх у адзін канец і прывязала да доўгай палкі. Атрымалася гэткая мятла: шапаціць, матляецца на ветры і сапраўды адпужвае.

Сёлета побач з гэтай «прыладай» з'явіліся і лазерныя дыскі. Нейкія сапсаваліся, з нейкіх інфармацыю перакінулі на флэшку... А самі «носьбіты» мы развесілі на галінках. Гэта вельмі зручна. Па-першае, сонечныя промні «счытваюць» стракатую вясёлку, ад чаго прыгажэе ўсё наваколле, а па-другое — канчаткова блытаюцца планы захопнікаў...

Так што на нашай вуліцы, можна сказаць, свята: па градках і пабудовах скачуць вясёлыя сонечныя «зайчыкі». А вось птушкі — пралятаюць міма.

Наталля ШВЕДАВА, *г. Мінск*

■ Свой погляд

ДЗЕ РАСТУЦЬ НАЙЛЕПШЫЯ ЛЕКІ?

У апошні час толькі і чуваць: «Нараджальнасць зніжаецца, людзі хварэюць, насельніцтва старэе!..» Ледзь не каравул...

А давайце задумаемся: чаму?

Як на мой погляд, дык таму, што яно, тое насельніцтва, абы-што ўжывае і, прабачце, абы-чым лечыцца! Самі дактары кажуць, што ўсе лекі — атрута. І пры гэтым выпісваюць іх ледзь не прыгаршчамі.

Тое ж і з ежай. Паглядзіце, што адбываецца ў нашых прадуктовых крамах — колькі там розных каробачак хімічнай вытворчасці, розных пакецікаў... Ці не ад іх, вось гэтых упаковак, у людзей з'яўляюцца розныя алергіі ды іншыя пабочныя з'явы?

Чаму славяцца траўнікі ды народныя лекары? Таму што лечаць толькі натуральнымі сродкамі, тым, што выраслі на лугах ды пагорках, у лясах і на ўзлесках. Крыніца вітамінаў і іншых гаючых рэчываў — зяленіва, садавіна і гародніна, ягады і грыбы, мёд... Карацей, нездарма кітайцы кажуць, што самыя лепшыя лекі растуць каля ганка.

І сапраўды: я вось не так даўно прачытаў пра фасолю. Ёй, аказваецца, можна лячыць усе хворыя органы і сістэмы. І калі б мы яе часцей ужывалі, значна менш хварэлі б. Проста, здавалася б!

Складанасць — на роўным месцы, як той казаў: дзе ўзяць тую ж фасолю і іншую садавіну-гародніну, калі ў мяне, напрыклад, побач з домам ёсць дзве аптэкі і тры прадуктовыя крамы. А вось па гародніну даводзіцца не ісці, а ўжо некуды ехаць.

Вось таму і думаю: можа, менш нам трэба лямантаваць пра пагаршэнне здароўя, а больш клапаціцца: людзі, у тым ліку і гараджане, проста павінны быць забяспечаны тым, што «расце каля ганка».

Г. ШЭРШАНЬ, *г. Мінск*

■ Ёсць меркаванне

ПРЫГАЖОСЦЬ ПРЫГАЖОСЦЮ...

Не, нездарма ў народзе кажуць, што каса — дзявочая краса. Доўгія валасы і сапраўды адзін з эталонаў прыгажосці. Напэўна, таму сярод дзяўчат, сярод маладзіц вельмі модна стала дэманстраваць яго — вольна рассыпаць па плячах.

Нічога не маю супраць: гэта добра выглядае, гэта хоць-нехаць прыцягвае ўвагу. Асабліва — калі тую паненку паказваюць у кіно альбо па тэлевізары, калі яна ідзе-шпацыруе па вуліцы альбо сядзіць дзесьці на лаўцы. А вось «кантакты» з ёй у перапоўненым транспарце... Калі ты, напрыклад, стаіш упрытык — у яе за спінай, і іншага месца, хоць плач, няма...

Тады ўжо «выйсце» адно: заплюшчыць вочы і не дыхаць (а тым больш, калі ты меншы ростам), бо добрая пасма валасоў, будзе «лезці» ў вочы, у рот, у нос... Аднак пры гэтым ні ў якім разе не расслабляцца, не траціць пільнасці, таму што ўладальніцы той распушчанай дзявочай красы не маюць звычкі думаць пра іншых, а вось час ад часу трэсці галавою, папраўляць сваю «прычоску» ды перакідваць валасы з аднаго боку на другі могуць...

Я ў такія моманты з большай прыязнасцю гляджу на дзяўчат, на жанчын з «хвастамі», з валасамі, закручанымі ў сціплы «смоўжык», нават з акуратнымі стрыжкамі. Бо, згадзіцеся, краса красой, прыгажосць прыгажосцю, а культура — культурай!

А. СЯМЁНАВА, *г. Мінск*

Даты Падзеі Людзі

1161 год — полацкім майстрам Лазарам Богшам створаны ўнікальны Крыж Еўфрасінні Полацкай, выдатны ўзор старажытнабеларускага прыкладнога мастацтва. У розныя гістарычныя перыяды гэтая духоўная святыня ўшаноўвалася праваслаўнай царквой і народам. Шасціканцовы крыж быў выраблены з кіпарысавага дрэва. Зверху і знізу яго пакрывалі залатыя пласціны, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі і дваццаццю эмалевымі мініяцюрамі. У сярэдзіне крыжа ў пяці «гнёздах» знаходзіліся хрысціянскія рэліквіі, прысланыя з Канстанцінопаля і Іерусаліма — часціцы Крыжа Гасподняга, кавалачак каменя ад труны Багародзіцы, часціцы мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона і кроў святога Дзмітрыя. Па баках святыня была абкладзена дваццаццю сярэбранымі з пазалотаю пласцінамі. Тэкст на крыжы змяшчаў закляцце, якое абяцала кару нябесную таму, хто ўкрадзе, прадасць святыню або проста вынесе яе з манастыра. Паводле задумы Еўфрасінні, яе крыж быў закліканы вечна «ажыўляць» душы ўсіх людзей, якія жылі на полацкай зямлі. У пачатку XIII ст. крыж вывезлі з Полацка смаленскія князі. У 1563 годзе Іван Грозны вярнуў святыню ў манастыр і загадаў больш ніколі яе адтуль не выносіць. У 1812-м манахі замуравалі крыж у нішы сабора і тым самым выратавалі яго ад марадзёраў. Пасля 1917 года звестак пра крыж вельмі мала. У 1928 годзе рэліквію перавезлі з Полацка ў Мінск, а затым у Магілёў, бо збіраліся перанесці туды сталіцу Беларусі. У пачатку 1941 года ў час бітвы за Магілёў крыж знік, яго след абарваўся. Адсутнасць неацэннага помніка культуры стала незаменнай стратай для грамадства. У 1997 годзе ювелірам М. Кузьмічом па вобразе і падабенстве зніклай святыні быў выраблены новы крыж. Копія крыжа Еўфрасінні Полацкай заняла сваё месца ў Свята-Крыжаўзвіжанскім саборы полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

1941 год — верш «Сяшчэнная вайна», які быў напісаны паэтам Васілём Лебедзевым-Кумачом усяго за адну ноч, апублікаваны адначасова ў дзвюх газетах — «Красной звезде» і «Известиях». Там яго і прачытаў кіраўнік Чырванасцяжнага ансамбля песні і танца Чырвонай Арміі Аляксандр Аляксандраў. Верш зрабіў на кампазітара такое моцнае ўражанне, што ён тут жа сеў за раяль. На другі дзень, прыйшоўшы на рэпетыцыю, Аляксандраў абвясціў: «Будзем развучваць новую песню». Ён напісаў мелам на грыфельнай дошцы словы і ноты — друкаваць не было часу! А спевакі і музыканты перапісалі іх у свае сшыткі. Менавіта гэтай песні наканавана было стаць своеасаблівым гімнам Вялікай Айчыннай вайны. Між тым растыражаваны міф пра тое, што «Свяшчэнную вайну» ансамбль Аляксандрава выконваў для войскаў, якія адпраўляліся на фронт на Беларускім вакзале ўжо 2 чэрвеня 1941 года, з'явіўся з лёгкай рукі Канстанціна Федзіна. Гэтая сцэна была створана выключна мастацкім уяўленнем пісьменніка ў рамане «Касцёр», напісаным у 1960-х гадах, і адсюль была перанесена ў многія выданні бы дакументальныя сачыненні. На самой жа справе толькі ў сярэдзіне

кастрычніка 1941 года, калі вораг захапіў Калугу, Ржэў і Калінін (цяперашнюю Цвер), «Свяшчэнная вайна» стала штодня гучаць па Усесаюзным радыё і пад яе сапраўды сталі адпраўляцца на фронт нашы байцы. Гэта была песня, з якой Чырвоная Армія пачала доўгую і цяжкую дарогу да Перамогі.

1938 год — нарадзіўся Валянцін Канстанцінавіч Лукашоў, беларускі вучоны ў галіне геахіміі і геалогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1986), доктар геолага-мінералагічных навук (1969), прафесар (1994). Распрацаваў сістэмы біяхімічнага кантролю навакольнага асяроддзя, стварыў серыю эколага-геахімічных карт гарадоў Беларусі. На прыкладзе Беларусі даў сістэматычную і найбольш поўную характарыстыку хімічнага саставу грунтоў розных эпох антрапагену, што з'явілася важнай тэарэтычнай базай для работ па пошуку карысных выкапняў, пры праектаванні інжынерных збудаванняў, водазабеспячэнні, меліярацыі, вырашэнні медыка-біялагічных і іншых праблем. Аўтар больш як 230 навуковых прац, у тым ліку 23 манаграфій, 4 вынаходстваў.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

На беларускую дзяўчыну
Ніхто йшчэ каменем не кінуў.
І не паважыцца кідаць.

Міхась КАЗІНЕЦ:

«МУЗЫКА — ДУША НАРОДА»

Быў цёплы ліпеньскі дзень. На пляжы санаторыя «Аксакаўшчына» адпачывала шмат людзей. Хто загараў, хто купаўся, хто веславаў на лодцы. І толькі адзін чалавек, мой сусед, вылучаўся сярод гэтага бесклапотна-вясёлага люду. Ён сядзеў у цені рэдзенькай вярбы, засяроджана ўзіраючыся ў вялікі, аб'ёмісты сшытак, які трымаў перад сабою і лісты якога час ад часу акуратна перагортваў. Пры гэтым яго твар увесь час быў надзвычай рухома-выразны: то прамяніўся светлай усмешкай, то нечакана хмурыўся, то раптам бровы здзіўлена падскоквалі ўгору... Я падсунуўся крыху бліжэй і асцярожна зазірнуў у загадкавы сшытак: чалавек чытаў ноты! Паглыблены ў таямнічы свет музыкі, ён нікога вакол не заўважаў і нічога не чуў.

Мая журналісцкая цікаўнасць у рэшце рэшт узяла верх над маёй далікатнасцю. І калі чалавек зрабіў перапынак, перавёўшы позірк на люстраную паверхню возера, я не вытрымаў, запытаўся:

— Прабачце, калі ласка, а што гэта вы так захоплена чытаеце?

Чалавек ніякавата ўсміхнуўся:

— Вось бачыце, усе нармальныя людзі адпачываюць, а мне, дурню, і тут спакою няма... — І ўжо сур'ёзна патлумачыў: — Чытаю партытуру. Хутка ў нас вельмі адказны канцэрт, а часу засталося няшмат.

Мы разгаварыліся і пазнаёміліся бліжэй. Маім суседам па пляжы аказаўся галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік праслаўленага ў рэспубліцы народнага аркестра імя Жыновіча Міхась Антонавіч Казінец.

Вечарам мы вырашылі разам пайсці на прагулку па ваколіцах санаторыя. Паблукалі крыху па баравых сцежках, з прыемнасцю ўдыхаючы густы смалісты водар, пастаялі на плаціне, любуючыся шумным вадаспадам, і нарэшце выйшлі да невялічкага жылога гарадка, заглянулі ў магазін, які яшчэ быў адкрыты, здзівіліся багатаму выбару прыстойных спіртных напіткаў. Не памятаю ўжо, хто з нас першы прапанаваў узяць чаго-небудзь для замацавання знаёмства, але ідэя была аднадушна падтрымана. Мы выбралі пляшку добрага грузінскага віна і пакіравалі да рэчкі. Там селі на хісткім драўляным мастку, звесіўшы ногі над вадою, і, папіваючы віно (шклянку нам дала з сабою спагадлівая прадаўшчыца), прагаварылі да глыбокай ночы. І калі вярталіся назад у санаторый, мы ўжо былі на «ты» і мне здавалася, што я ведаю Міхася Антонавіча даўным-даўно...

Было гэта больш за трыццаць гадоў таму. Казінец яшчэ толькі пачынаў узыходжанне да сваёй папулярнасці. Хаця ўжо меў званне заслужанага дзеяча мастацтваў. Астатнія, як ён кажа, «пагоны» — званні народнага артыста, прафесара кансерваторыі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі рэспублікі, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» — прыйшлі да яго пазней, значна пазней.

Усе гэтыя гады я ўважліва сачыў за творчым ростам Міхася Антонавіча, радаваўся таму, як прафесійна сталее, атрымлівае ўсё больш шырокае грамадзянскае і дзяржаўнае прызнанне вядомы музычны калектыў пад яго кіраўніцтвам. Спачатку аркестру было нададзена званне «акадэмічнага», а пасля — і «нацыянальнага». Стала зразумелым, што ў рэспубліцы, акрамя Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча, вырас яшчэ адзін магутны асяродак прапаганды і развіцця народнай культуры — Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Жыновіча. Калектыў, які сёння, на думку спецыялістаў, стаў сапраўднай музычнай візітоўкай Беларусі. У яго выкананні гучыць і сусветная класіка, і прэм'еры айчынных кампазітараў, і наша традыцыйная нацыянальная музыка ў свежых каларытных аранжыроўках.

І вось я ў рабочым кабінеце Міхася Казінца. Невялічкі пакой ён дзеліць разам са сваім дырэктарам Барысам Ліўшыцам. Абстаноўка ў кабінеце спартанская: два сталы, на адным з якіх, дырэктарскім, стаіць састарэлая мадэль камп'ютара; уздоўж сцяны некалькі просценькіх крэслаў, а пры ўваходзе, у тарцы, гэткая ж просценькая шафа, запоўненая кнігамі, нотамі, дыскамі. І, вядома ж, гаворка наша пачалася з пытання пра музыку.

I. САГРАВАЦЬ ДУШУ ЧАЛАВЕКА

— Музыка, здавалася б, самая абстрактная форма мастацтва. І тым не менш яна мае сваю нацыянальную афарбоўку. Праз што, якім чынам гэта перадаецца?

— Так, ноты ва ўсім свеце аднолькавыя. Але ў кожнага народа ёсць свая інтэрваліка, свой перапеў (я гэта называю ферманта голасу), што ўласціва толькі гэтаму народу. Музыка, як гэта ні дзіўна, пры ўсёй яе абстрактнасці нясе адбітак, адметнасць, своеасаблівы «водар» той зямлі, на якой яна нарадзілася.

Узяць, скажам, славянскія песні — рускія, беларускія, украінскія. Па сваім меласе яны вельмі блізкія, аднак наскую, родную мы пазнаём беспамылкова — сэрцам адчуваем. Нашы песні больш мілагучныя, душэўныя, часцей за ўсё журботныя, ціхія. І гэта вельмі важна, бо ў ціхай песні ёсць думка, ёсць пачуццё. Беларус, калі спявае, ён думае, суперажывае.

Нацыянальны каларыт музыкі ўгадваецца без асаблівай цяжкасці нават мала падрыхтаваным слухачом. Угадваецца па яе стылістыцы, танальнасці, рытміцы.

Наогул, народнай музыкі дрэннай няма. У кожнага народа — выдатнейшая музыка. Таму што музыка — гэта душа народа. Яго гісторыя. Яго культура. Праўда, акрамя народнай, ёсць музыка аўтарская, і яна можа быць не зусім прафесійная, не надта цікавая. Гэта іншая справа. Але народная мелодыя, тая, што ствараласа многімі людзьмі, шліфавалася, удасканальвалася на працягу многіх стагоддзяў, — такая мелодыя заўсёды выдатная.

— Думаю, што тваю пазіцыю падзяляюць далёка не ўсе. Ва ўсякім разе, ёсць людзі (я б іх назваў разбуральнікамі нацыянальнага, народнага меласу), якія выступаюць за нейкую ўніверсальную, касмапалітычную мову музыкі. Маўляў, век складаны, бурны. Змянілася псіхалогія слухача, які чакае новых формаў, новых рашэнняў. Але, як мне здаецца, жыццё такіх сачыненняў недаўгавечнае, таму што сапраўдная музыка заўсёды цесна звязана з народнай асновай, народнымі традыцыямі. Мы маем багаты нацыянальны матэрыял такога харастваі духоўнай сілы, што нам нічога больш і не трэба выдумляць. Што ты скажаш на гэты конт?

— Дык ты ўжо практычна і адказаў на сваё пытанне. Так, сучасныя сродкі масавай інфармацыі, асабліва аўдыявізуальныя, не з'яўляюцца, мякка кажучы, прыхільнікамі народнай музыкі. Наша сучаснае тэлебачанне нагадвае адну бясконцую рэкламу. А дзе ў якой рэкламе можна знайсці хоць бы прыкмету духоўнасці? Там падаюцца простыя, часам прымітыўныя рэчы, каб толькі чалавека здзівіць, захапіць у палон, убіць яму ў галаву неабходную ідэю. І нават тыя вялікія шоу-праграмы, якія ідуць на расійскім тэлебачанні, яны таксама, у прынцыпе, маюць гэткую ж мэту — здзівіць, захапіць. А дзеля гэтага патрэбен гром, шум, дым, святло...

Такое, з дазволу сказаць, «мастацтва» апускае чалавека да адчуванняў чыста фізіялагічнага характару. Ніякага мыслення, ніякага перажывання. Глядзі, спажывай, атрымлівай асалоду. А што застаецца ў душы? Нічога.

Я згодзен з табою: разбуральны працэс становіцца ўсё больш відавочным. Цяпер натуральнае спяванне, без мікрафона, ужо амаль паўсюдна не прымаецца. Правілам добрага тону лічыцца выступленне з мікрафонам. Гэта значыць, акадэмічнае спяванне выцясняецца.

Я разумею: трэба карыстацца і дасягненнямі тэхнічнага характару. Але калі эталонам майстэрства спеваў становіцца «Еўрабачанне», то мне застаецца толькі развесці рукамі. Там жа ад мастацтва нічога няма. Ёсць толькі шоу, у якое ўкладзены вялізныя грошы. У гэтую прыгожую карцінку і даволі простую мелодыю. Дарэчы, чым прасцей песня па мелодыі, тым яна лягчэй успрымаецца і тым больш падабаецца масаваму гледачу.

Здавалася б, ну і што? Каму ад гэтага кепска? Уся бяда ў тым, што такім чынам фарміруецца ў тысячаў, мільёнаў тэлегледачоў кепскі музычны густ, а яркая, але бесталентная пасрэднасць становіцца эталонам.

— А становіцца яна эталонам яшчэ і таму, што ў грамадстве, на мой погляд, страчана іерархія музычных каштоўнасцяў. На першы план выйшла поп-музыка, а класіка, якая так высока ставілася ў савецкія часы, адсунута кудысьці ўбок. Ці гэта маё памылковае ўспрыняцце?

— І так, і не. У савецкія часы сапраўды класічнае мастацтва (сімфанічнае, опернае) мела грунтоўную дзяржаўную падтрымку. Перш за ўсё — матэрыяльную. Паралельна з гэтым вялася шырокая прапаганда класікі, асабліва сярод моладзі. Практыкавалася (і трэба сказаць, была вельмі папулярнай) сістэма філарманічных абанементаў. Сімфанічная музыка пастаянна гучала на радыё, на тэлебачанні.

Так, усё гэта было. Але я не скажу, што цяпер у нас ад гэтага нічога не засталося. У нас, дзякуй Богу, яшчэ ходзяць і на сімфанічную музыку, і ў оперу. Дзяржава клапоціцца аб развіцці класічнага мастацтва ў меру сваіх магчымасцяў. Мы маем нармальныя, добра адрамантаваныя філармонію, оперны тэатр. Укладваюцца грашовыя сродкі ў падтрыманне ў належным стане ўсёй матэрыяльнай базы музычнага мастацтва. У Беларусі, у абласных цэнтрах, працуе некалькі сімфанічных аркестраў. Цяпер вось створаны яшчэ адзін — у Маладзечне.

І гэта няпраўда, што класічная музыка цяпер людзям нецікавая. Спашлюся на прыклад фестывалю «Звіняць цымбалы...» Там у нас на працягу трох дзён побач з народнай музыкай цудоўна суседнічае класічная. Выдатна прымаецца музыка духоўная, харавая, музыка, якая ствараласа ў Беларусі ў XVII-XVIII стагоддзях. І пастаўскім слухачам гэта цікава — а яны ж збіраюцца на нашыя канцэрты не толькі з горада, але і з навакольных вёсак.

Ведаеш, Зіновій, каб успрымаць музыку, яе трэба слухаць. Іншага выйсця няма. Для таго, каб любіць музыку, яе трэба ведаць. А гэта значыць, яна павінна пастаянна прысутнічаць у нашым паўсядзённым жыцці. Калі гэтага гучання не будзе — адкуль што прыйдзе?

Калі эталонам майстэрства спеваў становіцца «Еўрабачанне», то мне застаецца толькі развесці рукамі. Там жа ад мастацтва нічога няма. Ёсць толькі шоу, у якое ўкладзены вялізныя грошы.

— Міхась Антонавіч, мы гаворым з табою пра музыку сапраўдную, таленавітую. Але, пагадзіся, ёсць і адваротны бок медаля. Паўсюль — на дыскатэках, на пляжах, у рэстаранах і нават у канцэртных залах — на нас абрушваецца вадаспад ілжэмузыкі. Між тым, забруджванне гукавога асяроддзя — справа далёка не бяскрыўдная. Выдатны рускі спявак Аляксандр Вядзярнікаў, напрыклад, лічыць, што музыка — тая ж ідэалогія. Што будзе гучаць з падмосткаў оперных тэатраў, эстрадных пляцовак, тэлеэкранаў, вызначыць не толькі фарміраванне музычных густаў моладзі, але іх эстэтычныя і этычныя ідэалы. У выніку музыка трансфармуецца ў светапогляд. І таму кожны з тых, хто мае дачыненне да музыкі, у адказе за тое, якім стане новае пакаленне, што ў яго будзе за душою. Гэта я вяду да таго, што справа музычнага выхавання ў краіне павінна быць пастаўлена на дзяржаўную аснову. Ці ёсць у нас сёння праграма такога выхавання?

— Павінен сказаць, што асновы класічнай музычнай адукацыі былі закладзены на Беларусі менавіта ў савецкія часы. Тады склалася трохзвенная сістэма: музычная школа — музычнае вучылішча — кансерваторыя. І гэта сістэма давала выдатныя вынікі. Дзякуючы ёй сотні, тысячы талентаў з народа змаглі атрымаць грунтоўнае музычнае выхаванне. Зрэшты, чаму маглі — могуць і цяпер!

— Гэта добра. Але я не пра падрыхтоўку спецыялістаў, хаця гэта і надзвычай важны кірунак дзейнасці. Мяне цікавіць, як у нас арганізавана масавае музычнае выхаванне — у дзіцячых садках, агульнаадукацыйных школах, вышэйшых навучальных установах. У свой час, помніш, гэтым вельмі быў заклапочаны кампазітар Дзмітрый Кабалеўскі. Ён не толькі выкладаў урокі музыкі ў школе, але і напісаў спецыяльны падручнік. Яго сістэма спачатку была падхоплена з вялікім энтузіязмам, а пасля чамусьці паступова заглухла. Чаму?

— Па-першае, перашкодзілі сацыяльныя прычыны. Пачалася перабудова, якая прывяла да развалу краіны і страшэннага палітычнага і эканамічнага крызісу. Стала не да тонкасцяў музычнага выхавання. Па-другое, я не лічу, што сістэма Кабалеўскага не была на сто працэнтаў правільная. Таму што яна арыентавалася, галоўным чынам, на тэорыю, на аповед. А вось у Прыбалтыцы пайшлі сваім шляхам — у іх былі проста ўрокі спеваў.

Безумоўна, сёння ўсё гэта вярнуць цяжка. Але праграма музычнага выхавання (і тут я цалкам падзяляю клопат Дзмітрыя Кабалеўскага) абавязкова павінна быць. Якой яна мне ўяўляецца? Магчыма, да чацвёртага-пятага класа — гэта ўрокі спеваў. Але каб іх вёў спецыяліст, з якім дзеткам было б цікава. А далей, у старэйшых класах, разам са спевамі вучням трэба даваць ужо і тэорыю — расказваць аб асноўных музычных інструментах, знаёміць з рознымі відамі музычнага мастацтва і іх лепшымі ўзорамі. Неацэнную карысць для духоўнага выхавання даюць хоры — і класныя, і агульнашкольныя. І галоўнае — музыку слухаць.

Цяпер жа наша школа выбрала чамусьці вузкія кірункі: гуманітарны, прыродазнаўчы. А дзе ж духоўны, эстэтычны пачатак? Што для душы? Малады чалавек павінен развівацца. Як мага больш цесна далучацца да музыкі, да мастацтва, да літаратуры. І не толькі малады. Кожны з нас павінен развівацца — увесь час, да апошняга дыхання. Так нас стварыў Гасподзь. Калі толькі мы палічым, што з намі ўсё «а'кей», мы застынем, закасцянеем. Працэс самавыхавання, самапазнання павінен быць закладзены, выхаваны з дзяцінства.

II. ЯК МІХАСЬКА БАЦЬКУ ЎРАТАВАЎ

— Бацькоўскі парог... Вымавіш гэта — і душа сапраўды адгукаецца цёплымі, шчымлівымі ўспамінамі маленства. Раскажы крыху пра сваіх бацькоў, пра свае дзіцячыя гады.

— Маё маленства, на жаль, прыпала на гады вайны. Таму і ўспаміны мае не зусім тыповыя. Прыгадваецца зіма сорак другога года. Я хачу зайсці ў лазню, а мяне чамусьці туды не пускаюць. І нават не тлумачаць чаму. Пасля ўжо сказалі, што там хаваўся два тыдні наш блізкі сваяк, мамін брат, Андрэй Валынец. Ён перайшоў лінію фронту для таго, каб дапамагчы арганізаваць у нашай мясцовасці партызанскі рух. Пазней ён кіраваў партызанскім атрадам «Савецкая Беларусь» і быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Помніцца і такі эпізод. Было гэта летам. Якраз цвіла бульба. У нас гасцяваў другі мамін брат, меншы. Баявы, зухаваты хлопец, партызанскі разведчык. І толькі мы з ім распачалі нейкую гульню, як у хату ўбягае спалатнелая маці і спалохана кажа: «Немцы!» Хлопец — у акно і праз агарод да лесу. Немец, які стаяў ужо на двары, наўздагон яму даў аўтаматную чаргу. Але не па ім, а паўзверх. Пастраляў, пастраляў і пайшоў. А мог бы і забіць... І бацькоў, дарэчы, не зачапіў.

А было і такое. Увесну сорак чацвёртага нашу вёску нечакана акружылі гітлераўцы і загадалі ўсім выходзіць на поплаў, што каля школы. Сабраліся і старыя, і малыя. Стараста абвясціў, што непадалёку ад вёскі партызаны забілі немца, і таму ўсе яе жыхары будуць расстраляны. Жанчыны галасілі, дзеці плакалі. Мяне дзед засланіў сабою, каб я нават не бачыў, як гітлераўцы будуць страляць. Дзякаваць Богу, усё абышлося: стараста змог угаварыць каменданта не чапаць ні жыхароў, ні хат. Забілі толькі адну сям'ю, сын якой быў падпольшчыкам.

Побач з трагічным усплывае ў памяці і камічнае. Немцы вырашылі стварыць у нашай вёсцы самаахову. Але ўступаць у яе шэрагі ніхто не хацеў, бо трэба было даносіць у камендатуру пра партызан, хто з аднавяскоўцаў з імі звязаны. Прычапіліся і да майго бацькі: маўляў, уступай! А ён катэгарычна адмаўляўся. Тады яго паклалі на лаву і давай лупіць бізуном. А я якраз сядзеў за сталом і сёрбаў саладуху. Калі бацька закрычаў, я схапіў міску, кінуўся да немца і выплюхнуў саладуху яму ў твар. На нейкі момант той знерухомеў, а тады ўзяў мяне за каршэнь і ўрэзаў ручкаю бізуна па мяккім месцы. Але бацьку больш не біў. Пасля гэта было любімаю згадкаю ў сям'і: як Міхаська ўратаваў бацьку.

— Дарэчы, а хто былі твае продкі?

— Звычайныя земляробы. Тутэйшыя, з Віленшчыны. Бацька, Антон Іванавіч, родам з Цынцавічаў, а маці, Людміла Антонаўна, — з суседняй вёскі Жаўткі. Мелі неблагую па тым часе гаспадарку: каня, тры каровы, некалькі свіней. Двор заўсёды быў запоўнены курамі, гусямі. У прынцыпе, мы падлягалі раскулачванню. Калі прыйшлі, як бацька казаў, «другія Саветы» і сталі арганізоўвацца калгасы, то мы маглі загрымець у высылку. Але нас абараніў Валынец. Ён ужо быў сур'ёзным начальнікам у вобласці.

Мая беларускасць — ад маці. І ўсе маральныя, духоўныя каштоўнасці таксама. З дзяцінства вучыла мяне: «Гэтага не рабі — грэх, так не кажы — соромна...» Малапісьменная вясковая жанчына, яна была сапраўдным інтэлігентам. Старалася не пакрыўдзіць чалавека, дапамагчы яму. Клапацілася не толькі пра сваё, але і пра грамадскае дабро. Вельмі перажывала, калі дзе што рабілася не так, не па-людску.

Бацька ж быў чалавек крыху іншы. Паслужыўшы пэўны час у польскім войску жаўнерам, ён на ўсё жыццё захаваў сімпатыю да ўсяго польскага. Нават гаспадарчая тэхніка ў нас была толькі польская. Любіў слухаць па радыё Варшаву і кожнай добрай вестцы адтуль радаваўся як сваёй уласнай. Таму калі я аднойчы, вярнуўшыся з гастрольнага тура па Польшчы, стаў расказваць, што нашы суседзі жывуць яшчэ беднавата, скрозь палоскі аднаасобнікаў, бацька пакрыўдзіўся і тыдні два не размаўляў са мною.

І да выхавання дзяцей яны ставіліся па-рознаму. Маці ніколі не павышала на нас з братам голасу, заўсёды была ласкавая, спагадлівая. Бацька ж меў характар суровы, часам нават жорсткі. Па праўдзе кажучы, мы яго пабойваліся.

— Міхась Антонавіч, калі бацькі твае — звычайныя земляробы, то ад каго ў цябе гэтая незвычайная музыкальнасць?

— Ад дзеда. Іван Антонавіч — ці, як яго называлі ў вёсцы, Янук — выдатна іграў на скрыпцы. Ніводнае вяселле ў акрузе не абыходзілася без яго ўдзелу. А маці цудоўна спявала. У нашай хаце, колькі я сябе помню, заўсёды жыла матчына песня і дзедава музыка. Валынец, які даволі часта ў нас гасцяваў, любіў казаць: «Янук! Давай ярзоліцу на дваццаць чатыры калены і без ператыку!»

Таму зусім не дзіўна, што я ўжо недзе гадоў з шасці стаў уяўляць сябе музыкам. Браў дошку, набіваў два рады цвікоў і бегаў па іх пальцамі: тува-тува, тува-тува... Бачачы такую маю цягу да музыкі, маці ўгаварыла бацьку купіць для мяне гармонік. Між іншым, гэта была для сям'і немалая ахвяра — ажно пуд жыта. На той час — цэлае багацце.

Гармонік я асвойваў самавукам. Падбіраў мелодыі на слых і ў дзесяць гадоў ужо мог выконваць увесь вясковы рэпертуар — вальсы, полькі, прыпеўкі... І, відаць, іграў някепска, таму што ўзялі ў мясцовы ансамбль.

Аднак даволі хутка я зразумеў, што на гэтым вясковым, набытку далёка не заедзеш — трэба вучыцца. І калі мае бацькі ў 1957 годзе пераехалі ў Вілейку, я пайшоў там у восьмы клас сярэдняй школы і паралельна — у першы клас музычнай.

Пасля дзесяцігодкі я ўжо цвёрда вырашыў для сябе: буду толькі музыкантам. Паступаў у Мінскае музычнае вучылішча, але не хапіла балаў. Добрыя людзі падказалі мне: маўляў, едзь у Віцебск, там, здаецца, яшчэ працягваецца набор. І праўда, мяне праслухалі і прынялі без экзаменаў, залічыўшы мінскія адзнакі.

Ну а далейшы мой шлях ты ўжо ведаеш: з вучылішча — у кансерваторыю, з кансерваторыі — у аркестр народных інструментаў...

— Расказваючы пра гэта, ты некалькі разоў падкрэсліваў, што табе ў жыцці шанцавала на добрых, спагадлівых людзей. Хто яны былі, твае дабradзеі, твае настаўнікі?

— Першым сапраўдным настаўнікам у маім дырыжорскім лёсе быў Іосіф Абраміс, выкладчык кансерваторыі. Нейкія азы гэтай прафесіі я атрымаў яшчэ ў музычным вучылішчы. Іосіф Самуілавіч павёў далей: паказаў усе глыбіні і складанасці оперна-сімфанічнага дырыжыравання, прывіў неабходныя навыкі, якіх гэтая справа вымагае.

Не магу не сказаць словы глыбокай удзячнасці Георгію Іванавічу Жыхараву. Я паказваў яму свае інструментоўкі, ён вельмі падтрымліваў, заахвочваў мяне ў гэтым. І ў рэшце рэшт адыграў ключавую ролю ў тым, што мяне пасля заканчэння кансерваторыі пакінулі ў Мінску, што я стаў дырыжорам.

Асобна хачу сказаць пра Віталя Вітальевіча Катаева, бліскучага дырыжора і цудоўнейшага чалавека. У канцы шасцідзясятых ён прыехаў з Масквы ў Мінск і ўзначаліў Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР. Галоўная заслуга Віталя Вітальевіча ў маім станаўленні як дырыжора ў тым, што ён раскрываў сутнасць прафесіі, яе музычны характар, бытавы характар.

III. КАБ ЗМАГАЦЦА І ПЕРАМАГАЦЬ, ТРЭБА ЎМЕЦЬ І ВЕДАЦЬ

— Некалі Максім Горкі сказаў, што ў Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлопцы! Так па-народнаму проста пішуць, так ласкава, журботна, шчыра. Нашым бы трохі такіх якасцяў. Гэтыя словы класіка рускай літаратуры мне часам хочацца перайначыць і сказаць: ёсць у нас два цікавыя, цудоўныя хлопцы — Міхась Казінец і Міхась Дрынеўскі, якія так па-народнаму проста і глыбока мысляць, так таленавіта і шчыра слугуюць беларускай песні, роднай культуры. Ведаю, што вы з Міхасём Паўлавічам даўно і вельмі хораша сябруеце, крочыце па жыцці, што называецца, нага ў нагу. У вас нават усе ўзнагароды і званні аднолькавыя...

— Так, мы адным указам у 1978 годзе атрымалі званне заслужанага дзеяча мастацтваў. Народнымі артыстамі мы таксама сталі адначасова. А вось Дзяржаўную прэмію БССР Дрынеўскі атрымаў на два гады раней. І нам не хапіла двух тыдняў (разваліўся Савецкі Саюз) — і мы атрымалі б званне народных артыстаў СССР.

— У вас, як мне здаецца, ёсць не толькі заздросныя сяброўскія адносіны, але і добрае творчае спаборніцтва.

— Ёсць, ёсць. І гэта натуральна. Але ў мяне ніколі не было чорнай заздрасці, калі ў Міхася Паўлавіча атрымлівалася нешта цікавае, добрае. Я заўсёды радуюся любому поспеху Нацыянальнага хору. Аднак сам сабе думаю: трэба і мне нечым парадаваць, здзівіць гледача.

— А як вы з Дрынеўскім парадавалі і глыбока ўразілі гледачоў, калі сумесна падрыхтавалі цыкл праграм «Галасы Бацькаўшчыны». Гэта быў сапраўдны трыумф двух праслаўленых калектываў — Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча і Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча. У чым, на твой погляд, ашаламляльны поспех гэтых канцэртаў?

— Напэўна, у спалучэнні дзвюх магутных стыхій — народнай песні і народнага меласу. Магчыма, у тым, што мы змаглі абудзіць у слухачоў нешта глыбіннае, прыродна-геннае, закрануць запаветныя струны душы. А яшчэ, можа, у тым, што асяроддзе ў лельчыцкім Тонежы і ў вілейскіх Цынцавічах было аднолькавае...

— Дарэчы, пра Цынцавічы. Ты часта бываеш у роднай вёсцы? Як яна «пачувае» сябе цяпер?

— Як пачувае? Прывяду адзін прыклад. У свой час у вёсцы дзейнічала школа-сямігодка і былі нават паралельныя класы. Цяпер жа ўсяго шэсць вучняў. А чаму? Вёска, што мела некалі сто сорак двароў, вымірае. Моладзь з'язджае, застаюцца дажываць свой век толькі старыя. У некаторых дамах — ні душы.

— Вымірае вёска — значыць, знікаюць і носьбіты беларускай мовы. Ужо і вясковыя жыхары часцей за ўсё размаўляюць па-руску ці ў лепшым выпадку на вядомай трасянцы. Цябе гэта не трывожыць?

— Ведаеш што, пакуль будзе гэтая зямля, гэтыя людзі, на генетычным узроўні знішчыць беларускую мову немагчыма. Нашу вёску, магчыма, можна і папракнуць у тым, што яна адварочваецца ад свайго, роднага, але ёй жа трэба і падзякаваць за тое, што вытрымала страшэнны ціск савецкіх ідэолагаў на знішчэнне ўсяго нацыянальнага і ўсё ж захавала сваю ідэнтычнасць, няхай сабе і не ў такой ступені, як нашы суседзі-ўкраінцы.

— Міхась Антонавіч, ты ўжо больш за паўстагоддзя жывеш у горадзе. Ці застаецца якая сувязь з вёскаю?

— Сялянская закваска засталася ў мяне на ўсё жыццё. Я магу і каня запрэгчы, і за плугам, калі трэба, пахадзіць. Не магу бачыць, калі нейкі кавалак зямлі пустуе, зарастае пустазеллем. Грэх і сорам! Таму, атрымаўшы ў свой час дачны ўчастак, мы паставілі невялічкі садовы домік, а ўсе астатнія соткі былі старанна апрацаваны. На жаль, падтрымліваць такі парадак цяпер не хапае часу. Я з'яўляюся там раз у тыдзень, а то і ў два тыдні раз. Пад агарод пакінулі недзе соткі паўтары. Але калі бываю, то ўжо з шасці раніцы шчырую на градах. Мне гэта ў радасць. Люблю глядзець, як усё падымаецца, расце — бульбачка, цыбуля, агуркі... Гэта грэе мне душу.

— А чым яшчэ цешыш сваю душу? На чытанне застаецца час?

— Ну, па-першае, пасля таго, як я пакінуў пасаду рэктара Беларускай акадэміі музыкі, вольнага часу ў мяне крыху прыбавілася. А па-другое, кніга для мяне — гэта святло. Можна недаесці, недаспаць, але застацца без кнігі — немагчыма. Люблю літаратуру класічную, рэалістычную. Яна мацней бярэ за душу. Помню, калі чытаў «Людзі на балоце» Мележа — плакаў. Лічу, што гэты раман нават мацнейшы за «Ціхі Дон». Ва ўсякім разе для мяне. А «Новая зямля» Коласа! Гэта сапраўды энцыклапедыя народнага жыцця, якую можна чытаць і перачытваць бясконца. Асабліва лірычныя, філасофскія адступленні. Захапляюся творамі Шамякіна, Караткевіча, Быкава. З цікавасцю прачытаў нядаўна трылогію Гніламёдава пра заходнебеларускую вёску. Магчыма, твор напісаны крыху традыцыйна, але ў ім ёсць новы паварот у разуменні нашай гісторыі на пачатку XX стагоддзя.

Каб успрымаць музыку, яе трэба слухаць. Іншага выйсця няма. Для таго, каб любіць музыку, яе трэба ведаць. А гэта значыць, яна павінна пастаянна прысутнічаць у нашым паўсядзённым жыцці. Калі гэтага гучання не будзе — адкуль што прыйдзе?

Ведаеш, мы часам любім прыбядняцца, займацца самапрыніжэннем. Дык вось, калі гаварыць пра беларускую літаратуру, то мы з поўным правам можам ёю ганарыцца. На мой погляд, яна — адна з магутнейшых у Еўропе.

І наогул, не такія ўжо мы бедныя ў плане культуры. У нас вельмі і вельмі цікавы жывапіс. Узяць тую ж Віцебскую школу. Цудоўныя мастакі еўрапейскага маштабу! Плюс Бялыніцкі-Біруля, Хруцкі, Рушчыц, Шчамялёў, Савіцкі, Паплаўскі...

Што датычыцца музыкі, то прафесійна яна стала развівацца не так даўно, гадоў 70—80 таму. А раней усё, што ў нас ствараласа, вывозілася ў Еўропу і там заставалася. І ўсё ж, нягледзячы на сваю маладосць, беларуская музыка мае значныя дасягненні, годна глядзіцца на еўрапейскім фоне. Асабліва сімфанічная музыка. Кожны раз, калі мы яе іграліза мяжою, яна цудоўна прымалася.

— Што б ты назваў сваёй самай вялікай творчай і наогул жыццёвай удачай?

— У творчым плане — тое, што трапіў у выдатны калектыў народнага аркестра, да выдатнага дырыжора і цудоўнага чалавека Іосіфа Жыновіча. Самая вялікая жыццёвая ўдача — тое, што сустрэў сваю цяперашнюю жонку, Галіну Сяргееўну, з якой мы жывём ужо больш за 45 гадоў у ладзе і згодзе.

— Раскажы крыху пра сваіх сямейнікаў.

— У мяне цудоўная дачка Віка. Яна скончыла музычнае вучылішча, музычна-педагагічны факультэт Мінскага педінстытута. Піяністка. Працуе выкладчыкам у 9-й музычнай школе сталіцы. Сын Юрый — мой сябар, мая надзея. Скончыў музычную школу і мог бы ісці далей — здольнасцяў хапае. Але не захацеў — паступіў у радыётэхнічны. Цяпер працуе ў адной прыватнай фірме. А музыка засталася як хобі: іграе на гітары.

Маю траіх унукаў. Старэйшы, Аляксандр, ужо скончыў школу і пакуль шукае сябе. Сярэдні, Глеб, яшчэ вучыцца. А самая мая вялікая ўцеха — меншанькі, Міхаська, якому толькі год.

— І апошняя пытанне. Кажуць, што трэба служыць не музыцы, а музыкай служыць людзям. Ці згодны ты з гэтай формулай?

— Абсалютна згодны. Яно так і ёсць на самой справе. Музыка — гэта адно з самых дзівосных цудаў, створаных чалавецтвам. Бо хіба ж гэта не цуд, што тая ці іншая мелодыя можа абудзіць у чалавеку добрыя, светлыя пачуцці, выклікаць адчуванне радасці, замілавання альбо, наадварот, стварыць атмасферу смутку, тугі, прывесці ў стан раздражнення і гневу? Усё залежыць ад таго, якую музыку мы выбіраем. У народзе кажуць: «Хлеб ёсць траякі — белы, чорны і ніякі». Так і ў нашым выпадку. Музыка можа быць добрай, кепскай і ніякай. Мы імкнёмся несці людзям музыку добрую — тую, якая абуджае ў чалавеку імкненне да харастваі, выхоўвае ў ім мастака, творцу, дае адчуванне вышэйшай духоўнай сферы. Самыя тонкія, самыя патаемныя пачуцці, самыя няўлоўныя рухі душы, якія непадуладныя часам звычайнаму слову, можна перадаць музычнымі гукамі. Невыпадкова П.І.Чайкоўскі любіў паўтараць: «Там, дзе канчаецца слова, — пачынаецца музыка». А вось А.С. Пушкін быў перакананы, што з усіх асалод жыцця аднаму толькі каханню саступае музыка, але і каханне — мелодыя.

Служыць гэтай высакароднай справе — сапраўднае шчасце.

Гутарку вёў
Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий» – встроенные помещения

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191450284.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2, п.7 (№1508).

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – четверг с 9.00 до 17.30; пятница 9.00–16.00; обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» строительство не осуществляло.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – строительство многоквартирного жилого дома

Строительство осуществляется с выделением следующих пусковых комплексов:

I пусковой комплекс – жилой дом № 8 (по генплану) и благоустройство прилегающей территории;

II пусковой комплекс – встроенные помещения жилого дома № 8 (офисы, административно-торговые помещения, банк, кафе, творческие мастерские);

III пусковой комплекс – гараж (паркинг);

IV пусковой комплекс – жилой дом № 9 со встроенными помещениями (офисы) благоустройство прилегающей территории.

Начало строительства: 28 февраля 2012 года, окончание строительства – III квартал 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Главгосстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1217-15/11 от 10.02.2012 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 3663 от 08 декабря 2011 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/654-3240 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006004, расположенный по адресу: г. Минск, квартал пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-е Кольцо – ул. Нарочанская, площадью 2,7720 га для строительства объекта «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий»;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-209Ж-008/12 от 28.02.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «Монолит Групп». Договор строительного подряда № 99-12/11 от 17.01.2012 г.

Жилой дом № 8 (по генплану) состоит из встроенных помещений общественного назначения, жилой части, состоящей из 243 квартир и 2-уровневого гаража-стоянки на 246 м/мест. Дополнительно проектом предусмотрено строительство открытых автомобильных парковок, размещаемых вдоль проезжей части, общей вместительностью 75 м/мест. Количество этажей 11,13,15,16,11.

Объект ориентирован главным фасадом на проспект Победителей и является структурно повторяющимся элементом застройки, формирующим облик микрорайона в целом. Генеральный план застройки решен компактно с учетом рельефа местности, выгодного градостроительного положения, функционального зонирования территории, существующих и проектируемых транспортных и инженерных коммуникаций, а также обеспечения противопожарных норм и правил. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона.

Наружная отделка фасадов:

